МОСКВА 2 БАГАТ.
УЛ МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14
ВСЕСОЮЗН БИБ. КЕ ИМЕНИ
ОТД КОМПЛЕКТОВ

Пролетарыі ўсіх краін, аднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 292 (6569) | 20 снежня 1939 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб узнагароджанні і прэміраванні ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі — Пастанова Галоўнага камітэта Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Аператыўная зводка штаба Ленінградскай Ваеннай Акругі.

Да 60-годдзя з дня нараджэння таварыша Сталіна. Ем. Яраслаўскі — Вялікі правадыр народаў.

Азнамянуем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі.

24 СНЕЖНЯ — ВЫБАРЫ Ў МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ. **М. Бурак** — Сельсавет напярэдадні выбараў. **Слова маладых выбаршчыкаў. М. Сурмянкоў** — Буду галасаваць упершыню. **А. Багалёнак** — Выхаванка ленінскага комсамола. **М. Аршанскі** — Маладыя выбаршчыкі. **С. Кісель** — Вялікі палітычны ўздым.

П. Старавыбарны — Арганізавана сустрэць зімовыя канікулы ў школах.

А. Міньноў—Усебеларуская канферэнцыя выкладчыкаў педагогікі.

Сёння адкрываецца Гомельскі абласны рускі драматычны тэатр.

ЗА РУБЯЖОМ: Вайна ў Еўропе. На заходнім фронце. Першы буйны бой паміж германскай і англійскай авіяцыяй. Паездка Чэмберлена на заходні фронт. Вайна на моры. Каманда лінкора «Адмірал граф Шпее» ўзарвала і затапіла карабль. Мітынг салідарнасці з Совецкім Саюзам у Англіі. Паход супроць комуністычных газет у Швецыі. Адкрыццё літоўскага універсітэта ў Вільна. На франтах Кітая.

МНОЖЫЦЬ РАДЫ СТАХАНАЎЦАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ!

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка прадэманстрыравала перад усім светам сілу і магутнасць соцыялістычнага земляробства. Дзесяткі і сотні тысяч перадавікоў сельскай гаспадаркі наглядна паказалі, на якія цудоўныя справы здольна совецкае сялянства, сялянства, якое навекі вызвалена ад эксплаатацыі і рабства; сялянства, якое назаўсёды замацавалася на соцыялістычным шляху і будуе новае, поўнацэннае, заможнае і культурнае жыццё.

Наша большэвіцкая партыя і совецкі ўрад, якія штодзенна праяўляюць сталінскія клопаты аб калгаснай вёсцы, акружаюць асаблівымі клопатамі і ўвагай перадавікоў сельскай гаспадаркі, чыімі рукамі вырашчаны бліскучыя ўраджаі, чый асабісты прыклад пладатворнай стаханаўскай работы натхняе і кліча масы калгаснікаў на барацьбу за новыя перамогі, за далейшы росквіт соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Сёння мы друкуем пастанову Галоўнага камітэта Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі аб узнагароджанні і прэміраванні ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. За выдатныя поспехі ў сельскай гаспадарцы і перавыкананне паказальнікаў, устаноўленых для ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, 13 калгасаў, соўгасаў і МТС рэспублікі ўзнагароджаны дыпломам першай ступені і атрымліваюць прэмію па 10 тысяч рублёў і па легкавой машыне. 83 калгасы ўзнагароджаны дыпломам другой ступені, прэміяй па 5 тысяч рублёў і па матацыклу.

Гэтыя ўзнагароды і прэміі перадавым калгасы, соўгасы заслужылі ўзорнай стаханаўскай працай на соцыялістычных палях, фермах. Сярод іх — калгас «Чырвоны партызан» Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. ураджай зернавых 15,08 цэнтнера з гектара і бульбы 154.18 цэнтнера з гектара. Сярод іх — соўгас імені Молатава, Бамарынскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 2 годы ўлой малака па 2.078 літраў на фуражную карову і вырасціў 294 пяля, калгас «Другая пяцігодка» Магілеўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за два годы ўраджай ільновалакна па 6.25 цэнтнера з гектара, калгас імені Куйбышэва Бабруйскага раёна, «Спяг працы» Чэрыкаўскага раёна, «Ленінскі шлях» Шклоўскага раёна, імені Сталіна Горацкага раёна, соўгас «Рачкавічы» Чырвонаслабодскага раёна, конегалоўчая таварная ферма калгаса «Герой працы» Заслаўскага раёна, малочна-таварная ферма калгаса «III Інтэрнацыянал» Лёзнянскага раёна і дзесяткі іншых, якія праславіліся выдатнымі ўраджаямі, бліскучымі рэзультатамі працы на соцыялістычных фермах.

Рэзультаты работы ўзнагароджаных і прэміраваных калгасаў наглядна паказваюць усім калгасам рэспублікі, што ў нас ёсць магчымасці паўсямесна рэзка павысіць ураджай соцыялістычных палёў і прадуктыўнасць ферм, што поспех залежыць ад нас саміх, ад нашай большэвіцкай работы. І таму, з кожным днём шырыцца фронт калгасаў, якія спаборнічаюць за высокі сталінскі ўраджай, за права ўдзелу ў выстаўцы ў 1940 годзе.

Пачатае па ініцыятыве брыгадзіраў паляводчых і трактарных брыгад Сталінградскай вобласці ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за сто пудоў хлеба з гектара сустракае гарачую і ізелаву падтрымку ў многіх калгасах БССР. Следам за калгасам «Маяк соцыялізма» Барысаўскага раёна ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва брыгадзіраў-стопудовікаў уключыўся калгас «Совецкая Беларусь» Тураўскага раёна, «Свабода» Круглянскага раёна, рад калгасаў Аршанскага, Бабруйскага і іншых раёнаў рэспублікі. Прычым, асабліва радасна тое, што калгасы, якія ўключыліся ў спаборніцтва брыгадзіраў-стопудовікаў, не абмяжоўваюцца абавязацельствамі, а адразу-ж, па-дзелавому бяруцца за іх ажыццяўленне.

Вось што расказваюць ў сваім пісьме брыгадзіры калгаса «Совецкая Беларусь» Тураўскага раёна, які ўзнагароджан цяпер дыпломам першай ступені. Ужо ў гэтым годзе калгас з поспехам вырашыў задачу атрымання стопудовага ўраджаю зернавых, але тут не супакоіліся на дасягнутым. Ідзе барацьба за тое, каб у 1940 годзе атрымаць у сярэднім па калгасу 120 пудоў хлеба з кожнага гектара. Для гэтага будзе выкарыстан увесь багаты вопыт, накоплены калгасам, такія каштоўныя мерапрыемствы, як захаванне правільнага чаргавання культур па севаабароту, добрая апрацоўка глебы, радковая сяўба сартавым насеннем, абавязковае баранаванне азімых ранняй вясною, падкормка мясцовымі і мінеральнымі ўгнаеннямі, кароткія тэрміны сяўбы. У калгасе поўнасцю закончана засыпка і ачыстка насенных фондаў, закончан рамонт плугоў. Яшчэ з восені ў глебу ўнесена частка гною, цяпер разгарнулася загатоўка мясцовых угнаенняў.

Цяжка пераацаніць значэнне руху за сто пудоў хлеба з гектара. Калгасы, якія ўключыліся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва брыгадзіраў-стопудовікаў і па-большэвіцку рэалізуюць узятыя абавязацельствы, вырашаюць буйнейшую дзяржаўную задачу. Каб узвіць сабе народнагаспадарчае значэнне гэтага руху, дастаткова сказаць, што **калі па ўсёй краіне калгасы збяруць сярэдні ўраджай па 100 пудоў з кожнага гектара, мы атрымаем штогод каля 10 мільярдаў пудоў хлеба.**

Усе партыйныя і совецкія арганізацыі, земельныя органы і кіраўнікі МТС павінны пранікнуцца сазнаннем сваёй адказнасці за поспех руху брыгадзіраў-стопудовікаў. Трэба прызнаць, што пакуль-што кіруючыя арганізацыі многіх раёнаў і абласцей рэспублікі яшчэ не ўзначалілі руху брыгадзіраў-стопудовікаў. Яны чамусьці не ўбачылі ў гэтым спаборніцтве новы этап стаханаўскага руху ў калгаснай вёсны. Не чутна таксама голасу многіх спецыялістаў сельскай гаспадаркі, хаця ім прадстаіць тут вельмі многа работы. Няма чаго і даказваць, што ўсе напы арганізацыі абавязаны па-большэвіцку ўзначаліць барацьбу калгаснікаў за сто пудоў хлеба з гектара.

Гэта, зразумела, зусім не азначае, што можна пакінуць на самацёк барацьбу за ўраджай іншых культур, як напрыклад, ільну, бульбы. Наадварот. Справа ідзе аб высокім ураджаі **ўсіх** культур. І зусім правільна зразумелі сваю задачу калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Свабода» Круглянскага раёна. Разам з барацьбой за зернавыя яны распрацавалі і ўжо практычна ажыццяўляюць мерапрыемствы, што забяспечваюць ураджай ільновалакна па 6 цэнтнераў з гектара і высокі ўраджай іншых культур. Пяпер створаны выключна спрыяючыя ўмовы для ўздыму **ўсіх** галін сельскагаспадарчай вытворчасці.

Лічаныя дні аддзяляюць нас ад знамянальнай даты — дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Калгаснікі рэспублікі, як і ўвесь совецкі народ, адзначаюць перадвыбарчыя дні магутным вытворчым уздымам. Ідзе барацьба за высокі сталінскі ўраджай, за права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1940 годзе.

Няма сумнення, што пад спягам соцыялістычнага спаборніцтва калгасы даб'юцца новых поспехаў, будуць множыцца і расці рады стаханаўцаў сельскай гаспадаркі. Справа чэсці і прамы абавязак нашых партыйных арганізацый — узначаліць і кіраваць соцыялістычным спаборніцтвам калгасных мас.

АЗНАМЯНУЕМ ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

Вытворчыя поспехі мінскіх чыгуначнікаў

Уступіўшы ў соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую сустрэчу ўсенароднага свята — дня выбараў у мясцовыя советы, стаханаўцы-крываносаўцы паказваюць выдатныя ўзоры працы.

Токар-стаханавец, член партыі т. Яромка Владзімір адным з першых у паравозным дэпо пачаў працаваць на двух станках. Зараз ён сістэматычна выконвае ізённыя нормы на 300—350 проц. Малады токар-многастаночнік, комсамолец т. Кудрэвіч за 6 дзён другой дэкады снежня выканаў дзённыя нормы ў сярэднім на 360 проц.

Выдатныя ўзоры стаханаўскай работы паказваюць слесары дэпо тт. Харкаў і Шымарэў, якія выконваюць па 4—4,5 нормы ў дзень. Старшы прамывальшчык паравозных катлоў т. Суворaў выконвае ад 4 да 5,5 нормы ў дзень.

Н. СТРЭЛЬЧАНКА.

Дастойная сустрэча

ГОМЕЛЬ. Як да вялікай урачыстасці, рыхтуюцца працоўныя горада да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Горад прымае святочны выгляд: вуліцы, плошчы ўпрыгожваюцца сцягамі, партрэтамі правадыроў, транспарантамі. На плошчы імені Леніна ўстаноўлена вялікае мастацкае панно, адлюстроўваючае перамогі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Ноччу плошча азараецца вялікімі вогненымі літарамі, якія напамінаюць, што 24 снежня — дзень выбараў у мясцовыя советы.

Падрыхтоўка да гэтага свята суправаджаецца магутным уздымам палітычнага і вытворчага энтузіязма працоўных. Дзесяткі перадавых прадпрыемстваў горада датэрмінова выканалі гадавыя планы.

У азнаку падрыхтоўкі да выбараў калектыў фабрыкі «Палесдрук» асвоіў 25 новых відаў прадукцыі шырспажыву. Рабочыя стаханаўцы тт. Дудко, Рамаповская, Гершанок, вылучаныя кандыдатамі ў дэпутаты горсовета, штодзенна выконваюць па дзве нормы.

Вялікі вытворчы ўздым наглядаецца таксама на паравоза-вагонарамонтным заводзе. Стаханаўцы перадавога сталеліцейнага цэха перадаюць свой вопыт работы адстаючым рабочым. Стаханавец-фармаўшчык тав. Раманенка, заняты на фармоўцы букс для 50-тоннага вагона, пры норме ў 9 букс штодзенна фармуе 20. Свой стаханаўскі вопыт тав. Раманенка перадае радам стаячаму фармаўшчыку тав. Шэлегаву, які цяпер таксама значна перавыконвае вытворчае заданне.

Н. ГІРШЫН.

Соцыялістычнае спаборніцтва на лесазагатоўках

АСІПАВІЧЫ. Сярод лесарубаў, шофераў і возчыкаў разгарнулася шырокае соцыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае выкананне плана IV квартала і лепшую сустрэчу дня выбараў у мясцовыя советы.

Гужавы транспарт леспрамгаса датэрмінова выканаў заданне IV квартала. Пяршынства заваявала конбаза Лепельскага ўчастка, якая выканала 10 снежня квартальны план на 141 проц.

Вялікі вытворчы ўздым наглядаецца ў апошнія дні на Градзянскай аўтабазе. Калектыў аўтабазы з чэсцю ажыццяўляе свае абавязацельствы. Дзённая норма перавыконваецца. 13 снежня вывазка склала 456 кубаметраў пры норме 400. У гэты дзень шофер тав. Раманоўскі выканаў зменнае заданне па вывазцы на 304 пропанты. На 200 і больш пропантаў выконваюць штодзенна сваё зменнае заданне шоферы Кірыновіч, Сайкоўскі, Слепіца і Кубіс. Аднак, трэба адзначыць, што асобныя калгасы яшчэ не пераключыліся на лесавывазкі. Лепельскі сельсавет, напрыклад, павінен штодзенна пасылаць у лес 77 падвод, а пасылае толькі 12.

Выканалі гадавую праграму

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). 15 снежня чулочна-трыкатажная фабрыка імені Клары Цэткін датэрмінова выканала гадавую праграму. Выпушчана 7.300 тыс. пар наскоў і 2.500 тон трыкатажнага палатна. Усяго на 16.150 тыс. рублёў у нязменных цэнах 1926-27 гг.

Да канца года фабрыка дасць далаткова прадукцыі, прыкладна, на 900 тысяч рублёў.

***

МАГІЛЕЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Калектыў магілеўскага трубаліцейнага завода імені Мяснікова адзначае набліжэнне дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных вялікай вытворчай перамогай. На 14 снежня завод выпусціў прадукцыі на 4.140 тыс. рублёў пры плане 4.138.5 тыс. рублёў.

Калектыў завода змагаецца за тое, каб да канца года даць краіне прадукцыі звыш плана на 110 тыс. рублёў.

***

БАРЫСАЎ, 19 снежня. 17 снежня калектыў барысаўскай папяровай фабрыкі «Профінтэрн» выканаў гадавы план выпуску паперы. Замест 3.396 тон фабрыка выпусціла 4 тысячы тон. Калектыў фабрыкі ўзяў абавязацельства ў чэсць выбараў у мясцовыя советы даць дзяржаве звыш гадавога плана на 120 тысяч рублёў паперы.

Лесапільны завод імені Розы Люксембург таксама выканаў гадавы план на 100.2 пропанта. Калектыў завода абавязаўся выпусціць да канца года яшчэ на 150 тысяч рублёў гатовай лесапрадукцыі. (БЕЛТА).

***

ОРША. Выбарчую кампанію ў мясцовыя советы калектывы прадпрыемстваў адзначаюць новымі вытворчымі перамогамі.

9 снежня Якаўлевіцкая суконная фабрыка выканала гадавы план. Рабочы калектыў абавязаўся да дня выбараў у мясцовыя советы выпусціць прадукцыі звыш плана на 100 тысяч рублёў.

Вялікіх поспехаў дабіўся калектыў Копыскага ільнозавода. План загатовак ільнотрасты выканан па 115,5 проц.

Галавое заданне выкачала таксама швейная арцель «XX Кастрычнік». Члены арцелі абавязаліся даць звыш плана на 260 тысяч рублёў швейных вырабаў.

***

РАГАЧОЎ. На аснове шырока разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва калектывы ільнозавода і лесазавода імені Халтурына датэрмінова выканалі гадавыя вытворчыя праграмы. Калектыў Ціхінічкага спіртзавода, выканаўшы датэрмінова гадавое заданне, абавязаўся даць да канца года прадукцыі звыш плана на 1 мільён рублёў.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА
ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 18 снежня нашы войскі на **Мурманскім** напрамку занялі мястэчка **Пітнаярві** — 85 кіламетраў на поўдзень ад **Петсамо** (па дарозе). На іншых напрамках дробныя сутычкі разведчых часцей, а на **Карэльскім перашэйку** інтэнсіўная артылерыйская перастрэлка.

У радзе раёнаў мелі месца баявыя дзеянні нашай авіяцыі.

Група караблёў Балтфлота вяла абстрэл берагавых батарэй у раёне **Біорке.**

***

На працягу 19 снежня баявыя дзеянні выразіліся галоўным чынам у пошуках разведчыкаў, дробных сутычках і ізе-нідзе ў артылерыйскай перастрэлцы.

У радзе раёнаў мелі месца разведчыя і часткова баявыя дзеянні нашай авіяцыі. У завязаўшыхся паветраных баях нашай авіяцыяй было збіта 12 самалётаў праціўніка. З нашай авіяцыі не вярнуўся на базу адзін самалёт.

Група караблёў Балтфлота паспяхова бамбардыравала берагавыя батарэі ў раёне **Біорке.**

Прыбыццё германскай эканамічнай дэлегацыі

19-га снежня г. г. у Маскву прыбылі асобаўпаўнаважаны германскага ўрада па эканамічных справах п. Рытэр і п. Шнурэ, які ўзначальвае германскую эканамічную дэлегацыю, у якую ўваходзяць прадстаўнікі міністэрства народнай гаспадаркі, міністэрства земляробства, міністэрства замежных спраў і рад экспертаў.

На Беларускім вакзале прыбыўшых сустрэлі: нам. народнага камісара Знешняга гандлю т. А. Д. Круцікаў, нам. старшыні совецкай гаспадарчай дэлегацыі ў Германіі т. Г. Е. Саўчэнка, гандлёвы прадстаўнік СССР у Германіі т. Е. І. Бабарын, заг. пратакольным аддзелам НКЗС т. В. Н. Баркоў, заг. цэнтральна-еўрапейскім аддзелам НКЗС т. А. М. Александраў, нач. экспартнага ўпраўлення Народнага Камісарыята Знешняга гандлю т. А. Ф. Іназемцаў, нач. імпартнага ўпраўлення Народнага Камісарыята Знешняга гандлю т. В. А. Сергееў, в. а. нач. аддзела дагавораў Наркамата Знешняга гандлю т. Д. Д. Мішусцін, нач. Пратакольнай часткі Наркамата Знешняга гандлю т. С. А. Вшыўкоў, рэферэнт па Германіі Наркамата Знешняга гандлю т. С. П. Тачылін.

КНІГІ АБ ТАВАРЫШУ СТАЛІНЕ

У Дзяржаўным выдавецтве палітычнай літаратуры выходзіць у мастацкім выданні кніга К. Е. Варашылава «Сталін і Чырвоная Армія» і 5-е выданне кнігі Л. Берыя «Да пытання аб гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі».

Пад рэдакцыяй А. Фадзеева выпускаецца вялікі зборнік «Сустрэчы са Сталіным». У зборнік увайшлі 35 расказаў аб сустрэчах з любімым правадыром. Сярод аўтараў—тт. Яраслаўскі, Стаханаў, Сметанін, Папанін, Громаў, Валапянаў, Кокінакі, Байдукоў, Грызлубава, Барсава, Барэзін, Гудаў, Дземчанка, Борын, Ангеліна, Троіцкая.

Будзе выпушчана таксама кніга аб таварышу Сталіне Ем. Яраслаўскага.

***

Упершыню выйдзе асобным выданнем работа І. Сталіна «Аб дыялектычным і гістарычным матэрыялізме», напісаная таварышам Сталіным для «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Зноў выданы работы І. Сталіна «Марксізм і нацыянальнае пытанне», «Да пытанняў аграрнай палітыкі ў СССР». Выдаецца таксама «Прамова таварыша Сталіна на Першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў».

У мастацкім выданні выходзяць творы таварыша Сталіна «Аб асновах ленінізма» і «Да пытанняў ленінізма» (у адной кнізе), «Кастрычніцкая рэволюцыя і тактыка рускіх комуністаў», «Справаздачны даклад таварыша Сталіна на XVIII з'езде партыі аб рабоце ПК ВКП(б)» і кніга І. Сталіна «Аб Леніне» з ілюстрацыямі.

(ТАСС).

У РАЁНЕ ДРЭЙФА ЛЕДАКОЛА „СЕДОВ"

БОРТ ЛЕДАКОЛА «СЕДОВ», 18 снежня. (Радыё спец. кар. ТАСС). Учора ў раёне дрэйфа «Седова» была невялікая воблачнасць. Тэмпература мінус 36 градусаў. Дзьмуў паўночна-ўсходні вецер сілаю ў 4 балы. Перасоўванняў ільду не наглядалася.

Адбылася ўрачыстая нарада экіпажа. Седоўцы абмеркавалі пытанне аб падрыхтоўцы судна да наступаючага вываду з ільдоў. Усе работы выпрацавана закончыць датэрмінова. Да выканання намечанага плана работ ўжо прыступілі.

Нашы каардынаты — 82 градусы 44.9 мінуты паўночнай шыраты. 6 градусаў 20 мінут усходняй даўгаты. На судне ўсё добра. Усе бадзёры і здаровы.

Н. БЕКАСАЎ.

«МУРМАНЕЦ» У ДРУГІ РАЗ ВЫШАЎ ДА КРОМКІ ІЛЬДОЎ

БАРЭНЦБУРГ, 18 снежня. (ТАСС). Каманда зверабойнага бота «Мурманец» паспяхова выканала заданне начальніка Галоўнапаўночморшляху Героя Совецкага Саюза І. Д. Папаніна па разведцы ільдоў на шляху дрэйфа «Седова», устанавіла месцы найбольш блізкага падходу да ледакола.

15 снежня «Мурманец», які стаяў у Барэнцбургу, атрымаў распараджэнне ад тав. Папаніна выйсці ў другі раз на абследванне кромкі ільду ў раёне ранейшай разведкі. 16 снежня судно вышла ў мора.

Кандыдат у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных зменны майстар шакаладнага цэха кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» Марыя Раманаўна Іваноўская.
Фото В. Марцыёнка. (Фотахроніка БЕЛТА).

ДАКЛАДЫ І ГУТАРКІ АБ ТАВАРЫШУ СТАЛІНЕ

У гарадах і сёлах БССР шырока разгарнулася падрыхтоўка да 60-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна. Наладжваюцца даклады, лекцыі і гутаркі. Прапагандысты і агітатары знаёмяць працоўных з біяграфіяй таварыша Сталіна, з яго вялікім жыццём і рэволюцыйнай дзейнасцю.

У мінскім Доме партыйнага актыва адкрылася вялікая выстаўка дакументаў і фотаматэрыялаў, адлюстроўваючых жыццё і дзейнасць таварыша Сталіна. Выстаўка размешчана ў двух прасторных залах. Яе абслугоўваюць кансультанты гаркома КП(б)Б і экскурсавод.

Выстаўкі і фотавітрыны, прысвечаныя вялікаму Сталіну, адкрыты ў бібліятэках і парткабінетах горада.

У радзе інстытутаў сталіцы БССР (медыцынскі, політэхнічны і інш.) склікаюцца спецыяльныя навуковыя сесіі, прысвечаныя таварышу Сталіну.

У дзень 60-годдзя вялікага правадыра на станкабудаўнічым заводзе імені Варашылава, заводзе «Большэвік» і іншых прадпрыемствах і ва ўстановах адбудуцца сходы і вечары.

★

У доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава ў Мінску адбыўся вялікі літаратурна-музыкальны вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння таварыша Сталіна. Зал запоўнілі байцы і камандзіры гарнізона і члены іх сямей. Даклад на тэму «Сталін у мастацкай літаратуры і творчасці народаў СССР» зрабіў лектар Цэнтральнага Дома Чырвонай Арміі тав. Федэрс.

З чыткай новых вершаў аб Сталіне выступілі народныя паэты БССР Янка Купала і Якуб Колас.

У фае канцэртнага зала Дома Чырвонай Арміі адкрылася фотавыстаўка, прысвечаная таварышу Сталіну.

★

У партыйным кабінеце палітаддзела **Гомельскага** аддзялення Беларускай чыгункі адкрылася выстаўка, прысвечаная таварышу Сталіну. Тут прадстаўлены літаратура і фотаілюстрацыйныя матэрыялы, якія ярка аллюстроўваюць жыццё і дзейнасць геніяльнага правадыра народаў. Штодзенна ў парткабінет прыходзяць агітатары, партыйныя работнікі, чыгуначнікі і члены іх сямействаў для азнаямлення з выстаўкай. На палявых станцыях наладжваюцца чыткі матэрыялаў аб вялікім Сталіне з кніг, газет і журналаў. 20 агітатараў Гомельскага тэхнікума шляхоў зносін выехалі на лінію Гомель—Буда-Кашалёў для правядзення гутарак з выбаршчыкамі аб жыцці і дзейнасці таварыша Сталіна.

★

На занятках звеньняў піонеры **Магілева** вывучаюць біяграфію таварыша Сталіна, развучваюць песні і вершы аб вялікім правадыру, рыхтуюць альбомы аб жыцці і дзейнасці Іосіфа Вісарыёнавіча.

Комсамольская арганізацыя Магілеўскай швейнай фабрыкі рыхтуе вечар моладзі, на якім будзе прачытан даклад аб 60-годдзі таварыша Сталіна. Бібліятэка фабрыкі арганізавала фотавітрыну, якая паказвае жыццёвы шлях вялікага настаўніка, генія чалавецтва таварыша Сталіна.

★

Вялікая выстаўка, прысвечаная таварышу Сталіну, адкрылася ў **Полацку** ў Доме партасветы.

★

У калгасе «Рассвет». **Заслаўскага** раёна, настаўнік тав. Гарошка правёў некалькі заняткаў з комсамольцамі па вывучэнню біяграфіі таварыша Сталіна.

21 снежня на сходзе калгаснікаў будзе зроблен даклад аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці таварыша Сталіна. Пасля даклада комсамольцы прачытаюць вершы і ўрыўкі з мастацкіх твораў аб Сталіне.

★

На Аршанскім мясакамбінаце днямі адкрыўся выдатна афармлены сталінскі кабінет, які знаёміць наведвальнікаў з асноўнымі вехамі жыцця і дзейнасці таварыша Сталіна.

У кабінеце ёсць фотавітрыны на тэмы з жыцця і дзейнасці вялікага правадыра народаў. Асаблівую ўвагу прыцягваюць фотавітрыны «Таварыш Сталін у ссылцы», «Таварыш Сталін за работай».

У кабінеце многа партрэтаў, плакатаў і лозунгаў. Ёсць спецыяльная выстаўка твораў таварыша Сталіна.

Кабінет наведваюць штодзенна многа рабочых, служачых, інжынераў мясакамбіната, якія з цікавасцю знаёмяцца з жыццём вялікага правадыра народаў.

Альбом наглядных дапаможнікаў „XVIII з'езд ВКП(б)"

Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры выпусціла з друку альбом наглядных дапаможнікаў «XVIII з'езд ВКП(б)», падрыхтаваны навуковымі супрацоўнікамі кабінета сацыяльна-эканамічных навук Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК ВКП(б) пад агульным кіраўніцтвам Е. Варашылавай. Адказны рэдактар Г. Александраў.

Альбом складзен па матэрыялах XVIII з'езда ВКП(б). У яго ўваходзіць каля 50 плакатаў. У дыяграмах, красачных рэпрадукцыях, фотаздымках ілюструюцца матэрыялы XVIII з'езда партыі.

Альбом з'явіцца каштоўным дапаможнікам для вывучаючых матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б).

(ТАСС).

Паведамленне

21 снежня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Тэатра оперы і балета адбудзецца ўрачысты сход партыйнага актыва горада Мінска, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння Іосіфа Вісарыёнавіча СТАЛІНА.

Білеты атрымаць у райкомах КП(б)Б.

МІНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

24 снежня—выбары ў мясцовыя советы

Слова маладых выбаршчыкаў

★ ★ ★

БУДУ ГАЛАСАВАЦЬ УПЕРШЫНЮ

Мне споўнілася 18 год. 24 снежня г. г. першы раз у сваім жыцці я буду прымаць удзел у выбарах органаў дзяржаўнай улады.

Нарадзіўся я ў 1921 годзе ў беднай сялянскай сям'і. Толькі дзякуючы совецкай уладзе атрымаў магчымасць вучыцца. Скончыў сямігодку, уступіў у комсамол. Люблю працу па сельскай гаспадарцы, і застаўся працаваць у калгасе.

Моладзь і дарослыя калгаснікі паважаюць мяне, як стахановца, як актыўнага комсамольца. Я выпісваю і чытаю газеты, маю асабістую бібліятэчку. У сваёй вучобе і практычнай рабоце змагаюся за тое, каб быць дастойным ленінска-сталінскага комсамола. Комсамольцы даверылі мне кіраваць арганізацыяй. Аўтарытэт комсамольскай арганізацыі ў калгасе за апошні час значна вырас. Як бліжэйшыя памочнікі партыі, мы клапоцімся аб гаспадарцы, актыўна змагаемся за быстрае і дакладнае правядзенне калгасам у жыццё дырэктыў нашай партыі, нашага совецкага ўрада.

Зараз комсамольская арганізацыя актыўна рыхтуецца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Асабіста я працую даверанай асобай на ўчастку, арганізоўваю агітацыю за кандыдата ў Магілеўскі абласны совет тав. Лідзію Міхайлаўну Стэрн.

Жыццёвы шлях нашага кандыдата тав. Л. М. Стэрн — ад сіраты, выхаванкі дзіцячага дома да выконваючай абавязкі рэдактара абласной газеты—гэта жывы прыклад таго, як партыя большэвікоў расціць і выхоўвае выдатных інтэлігентаў з працоўнага народа. Разам з усімі выбаршчыкамі Макранскай выбарчай акругі № 52 я з радасцю аддам свой голас за гэтую верную дачку народа. Таксама з вялікім задаваленнем я буду галасаваць і за кандыдата ў раённы совет—каморніка тав. Б. Я. Аўдзеева і за кандыдата ў сельсовет калгасніка-стахановца тав. С. Е. Казлова.

Я з радасцю аддам свой голас за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных таму, што яны з'яўляюцца людзьмі, да канца адданымі партыі Леніна—Сталіна, партыі, якая дала нам такую радасную і шчаслівую маладосць.

Міхаіл СУРМЯННКОЎ,
калгаснік калгаса «Маяк Комуны» Быхаўскага раёна.

ВЫХАВАНКА ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА

Гэтымі днямі ў памяшканні фабрыкі-кухні перад выбаршчыкамі 3-га ўчастка Кагановіцкага раёна выступіла малады кандыдат у дэпутаты райсовета Севасцьянава Людміла Ільінічна.

Тав. Севасцьянава 1919 года нараджэння. У капіталістычных дзяржавах ні адна дзяўчына яе ўзросту не можа нават і марыць аб удзеле ў выбарах.

З прыкметным хваляваннем Людміла Севасцьянава шчыра, ад душы выразіла глыбокую ўдзячнасць калектыву студэнтаў і навуковых работнікаў. БДУ, аказаўшаму ёй вялікае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Кагановіцкага райсовета па 45-й выбарчай акрузе.

— Я глыбока шчасліва. Для мяне, маладой совецкай дзяўчыны, няма большай радасці, як выступаць сёння перад сваімі выбаршчыкамі. Няма большага шчасця, чым шчасця жыць і працаваць у нашу сталінскую эпоху.

Я высока цаню гэта давер'е. Я прыкладу ўсе свае сілы, усе свае веды, каб апраўдаць тую высокую чэсць і давер'е, якое вы мне аказалі. Для мяне няма вышэйшай мэты ў жыцці, чым служба справе народа, справе, якой прысвяцілі сваё жыццё лепшыя людзі чалавецтва Ленін і Сталін.

Я дзякую, — заканчвае сваё выступленне т. Севасцьянава, — слаўны ленінскі комсамол, які мяне выхаваў, я дзякую вялікую партыю Леніна—Сталіна, я дзякую найвялікшага з вялікіх людзей нашай слаўнай эпохі таварыша Сталіна.

***

Васьмігадовай дзяўчынкай, займаючыся ў пачатковай школе, Людміла Севасцьянава ўступіла ў піонерскую арганізацыю. Людміла расла энергічнай, дысцыплінаванай, прагнай да вучобы дзяўчынкай.

Піонеры любілі яе за імкненне быць карыснай калектыву і не раз выбіралі яе сваім дэлегатам на раённыя і гарадскія піонерскія злёты. Так у піонерскім асяродзі фарміраваліся якасці перадавой совецкай дзяўчыны.

У 1937 г. т. Севасцьянава ўступіла ў рады ленінскага комсамола. У гэтымжа годзе яна паспяхова закончыла мінскую сярэднюю школу № 25.

Імкненне да далейшай вучобы не пакідае Людмілу, тым больш, што к гэтаму ёсць усе магчымасці, і яна паступае ў Беларускі дзяржаўны універсітэт на хімічны факультэт. Цяпер Людміла займаецца на 3-м курсе.

З юнацкім запалам, як сотні і тысячы нашых совецкіх дзяўчат, не ведаючы стомленасці, авалодвае яна вышынямі навукі і тэхнікі.

Тав. Севасцьянава ведае, якія вялікія задачы стаяць у трэцяй пяцігодцы перад хімічнай прамысловасцю. Яна цвёрда памятае, што «Трэцяя пяцігодка — пяцігодка хіміі». Усе праметы яна зліе на выдатна. У той-жа час Людміла прымае самы дзейны ўдзел у комсамольскім жыцці. Яна з'яўляецца членам бюро комсамольскай арганізацыі.

Выхаванка слаўнага ленінска-сталінскага комсамола, лепшы прадстаўнік нашай сталінскай моладзі, Людміла Ільінічна Севасцьянава апраўдае высокае давер'е сваіх выбаршчыкаў.

А. БАГАЛЕНАК.

МАЛАДЫЯ ВЫБАРШЧЫКІ

Аршанскі ільнокамбінат — чалавёжнае прадпрыемства. 24 снежня дзесяткі выбаршчыкаў камбіната ўпершыню прымуць удзел у выбарах мясцовых органаў нашай улады.

Упершыню будзе галасаваць комсамолка-стахановка тав. Альхіменка. Яна — адна з лепшых стаханавак ткацка-падрыхтоўчага цэха, штомесячна выконвае план на 170 проц. і працуе інструктарам па абучэнню адстаючых работніц.

Вялікім аўтарытэтам сярод работніц ільнокамбіната карыстаецца комсамолка-стахановка Люба Каробкіна. Люба — прафорг і комсорг цэха, з 1 лістапада працуе інструктарам стаханаўскіх метадаў работы. Тав. Каробкінай аказана вялікая чэсць і давер'е — яна вылучана кандыдатам у дэпутаты горсовета.

Малады выбаршчык Давід Гуцін нядаўна вылучан на пасаду начальніка, раней адставаўшага ткацка-падрыхтоўчага цэха. Зараз гэты цэх адзін з перадавых. Тав. Гуцін прымае актыўны ўдзел у комсамольскім і профсаюзным жыцці, з'яўляецца рацыяналізатарам.

Вычатніку вучобы школы фабзавучэ тав. Ракаўцу споўнілася 18 год. Ён — член фабкома, працуе інструктарам ППХА і рыхтуе 25 значкістаў, з'яўляецца агітатарам. Яго таварышы-комсамольцы Грыгорый Шэрстнёў, Змітрок Магучы, Пётр Кіпцікаў і інш. таксама ўпершыню прымуць удзел у галасаванні. Усе яны вылатнікі вучобы, займаюцца ў куляцкім гуртку, працуюць агітатарамі, маюць па некалькі абаронных значкоў.

Комсамольская арганізацыя школы паслала на выбарчыя ўчасткі 20 агітатараў, якія шырока разгарнулі масавую работу сярод насельніцтва горада.

М. АРШАНСКІ.

★

ВЕРНЫ СЫН НАРОДА

Клуб перапоўнен. Больш трохсот выбаршчыкаў 329-й выбарчай акругі прышлі на сустрэчу з сваім кандыдатам у дэпутаты Мінскага горсовета тав. Станіславам Пятровічам Шаблоўскім.

Адкрываецца сход. Выступае даверaны па 329-й выбарчай акрузе тав. А. С. Хурсік.

— Усе мы паважаем Станіслава Пятровіча Шаблоўскага за яго скромнасць, прастату, добрасумленную работу. Гэта ініцыятыўны чалавек, які ўнёс не адну карысную рацыяналізатарскую прапанову на заводзе «Ударнік». Ён з'яўляецца ініцыятарам стахановскага руху на прадпрыемстве, вытворчае заданне выконвае на 200—250 проц. Трох чалавек ён навучыў складанай кваліфікацыі электразваршчыка.

Цёпла спатканы выбаршчыкамі, выступіў з прамовай Станіслаў Пятровіч Шаблоўскі.

З прамовы тав. А. С. Шаблоўскага

Таварышы выбаршчыкі! Многія з вас добра мяне ведаюць. Нарадзіўся я ў 1910 годзе на хутары Палінараве, Прыгараднага сельсовета Мінскага раёна, у сям'і земляроба-бедняка.

У 1933 г. я паступіў на завод «Ударнік» і праз кароткі час аўладаў электразваршчыка справай. Потым вывучыў і слясарнае майстэрства. Зараз працую слесарам.

Мне, простаму рабочаму, калектыў завода аказаў вялікае давер'е, вылучыў кандыдатам у дэпутаты Мінскага горсовета. Сэрца поўніцца радасцю: просты слесар стаў паважаным чалавекам, якому даверяюць работу вялікай дзяржаўнай важнасці. У гэты радасны дзень мне хочацца, перш за ўсё, сказаць аб самым дарагім чалавеку, творцу новага жыцця — любімым Сталіне. Усім сэрцам, усімі пачуццямі я з родным бацькам вялікім Сталіным, з комуністычнай партыяй. Гэта партыя Леніна—Сталіна, гэта любімы Сталін паднялі мяне на такую вышыню.

Таварышы выбаршчыкі, я ад усёй душы дзякую за аказанае давер'е. Няма большага шчасця для совецкага грамадзяніна, як быць выбраным народам і выконваць яго волю. Я запэўняю вас, што буду працаваць так, як належыць большэвіку. Усе свае сілы, усё жыццё аддам за партыю Леніна—Сталіна, за любімую радзіму, за вялікі совецкі народ.

ВЯЛІКІ ПАЛІТЫЧНЫ УЗДЫМ

З вялікім палітычным і вытворчым уздымам рыхтуюцца працоўныя Слабода-Кучынскага сельсовета Копыльскага раёна, да выбараў у мясцовыя советы. З кожным днём усё шырэй разгортваецца агітацыйна-масавая работа на выбарчых участках. У 6 калгасах сельсовета працуюць 45 агітатараў, якія сістэматычна адзін раз у пяцідзёнку праводзяць гутаркі з насельніцтвам аб Сталінскай Канстытуцыі, выбарчым законе, міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.

Прэзідыум сельсовета перыядычна заслухоўвае агітатараў, аказвае дапамогу ў іх рабоце. Мы правялі пяць спецыяльных пасяджэнняў прэзідыума з адчотамі агітатараў і 7 інструкцыйных нарад старшынь участковых і акруговых выбарчых камісій.

У працэсе падрыхтоўкі да выбараў сельсовет мабілізуе насельніцтва на выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

У астаўшыяся дні мы яшчэ шырэй разгорнем агітацыю за вылучаных кандыдатаў у дэпутаты — лепшых людзей нашага сельсовета — і забяспечым новую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у мясцовыя советы.

С. С. КІСЕЛЬ —
старшыня Слабода-Кучынскага сельсовета Копыльскага раёна.

Да 60-годдзя з дня нараджэння таварыша Сталіна

ВЯЛІКІ ПРАВАДЫР НАРОДАЎ

Павучальны і прыгожы, поўны трывогі, клопатаў і барацьбы жыццёвы шлях таварыша Сталіна. З ранніх юнацкіх год ён — бэц за справу партыі, за справу рабочага класа, справу працоўных. З таго моманту, калі таварыш Сталін пазнаёміўся з вялікім вучэннем Маркса і Энгельса, ён стаў палкім яго прапагандыстам, абаронцам творчага рэволюцыйнага марксізма. З таго моманту, калі ён пазнаёміўся з геніяльным прадаўжальнікам справы Маркса і Энгельса — з Леніным, — ён стаў такім-жа палкім марксістам-ленінцам.

З другой палавіны 90-х годаў і да нашых дзён таварыш Сталін заўсёды нязменна ў перадавых радах сусветнай партыі комунізма. Ён — верны яе сцяганосец, ён — слаўны арганізатар і будаўнік сусветнай большэвіцкай партыі, ён— неўстрашымы яе барацьбіт. Радам з Леніным, пачынаючы з канца 90-х годаў, і заўсёды разам з Леніным, заўсёды па адной дарозе, ніколі не зварочваючы з гэтага шляху, ідзе таварыш Сталін. Падвяргаемы нясцішнна праследванням царызма, кідаемы з адной турмы ў другую, зноў і зноў ганімы ў далёкую ссылку, таварыш Сталін вяртаецца нязменна да свайго баявога паста.

Сталін разам з Леніным кіруе падрыхтоўкай партыі да кастрычніцкага штурму. Сталін разам з Леніным арганізуе перамогу Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Ён разам з Леніным будуе новую, соцыялістычную дзяржаву. Ён грудзьмі сваімі абараняе яе на ўсіх франтах. Ён разам з Леніным будуе Трэці, Комуністычны Інтэрнацыянал. Ён абараняе яго ад усіх апартуністаў, ад усіх ворагаў марксізма-ленінізма. Ён — правадыр вялікага міжнароднага саюза комуністаў усіх краін. Ён — любімы правадыр народаў.

Таварыш Сталін — геніяльны натхнілець, арганізатар усіх соцыялістычных перамог. Па яго асабістых указаннях складзены вялікія пяцігадовыя планы, ажыццяўленне якіх ператварыла нашу краіну ў магутную дзяржаву соцыялізма. Дзякуючы яго выключным клопатам дасягнута магутная абароназдольнасць СССР.

Заўсёды таварыш Сталін трымае сваю баявую пэйную зброю напагатове. Ён адточвае гэтую зброю і вучыць нас умела карыстацца ёю. Ён разам з Леніным і самастойна распрацоўвае вялікае вучэнне марксізма-ленінізма як кіраўніцтва да дзеяння. Нацыянальнае пытанне; пытанне аб перамозе соцыялізма ў адной краіне; аб ролі советаў; аб дзяржаве пры соцыялізме ў капіталістычным акружэнні; аб дыктатуры пролетарыята як зброі ў барацьбе за комунізм; аб соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны; аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі і аб ліквідацыі кулацтва як класа; аб выхаванні соцыялістычных кадраў; аб народнай соцыялістычнай інтэлігенцыі, — усе гэтыя і многія іншыя важнейшыя пытанні тэорыі і практычнага ажыццяўлення комуністычнай праграмы распрацаваны былі таварышам Сталіным.

Выдатны большэвік Сергей Міронавіч Кіраў, чыё жыццё абарвана было здрадніцкім стрэлам трацкісцкага бандыта Нікалаева, гаварыў у 1934 годзе на V абласной і II гарадской Ленінградскай партканферэнцыі:

«Цяжка ўявіць сабе фігуру гіганта, якім з'яўляецца Сталін. **За апошнія годы, з таго часу, калі мы працуем без Леніна, мы не ведаем ні аднаго павароту ў нашай рабоце, ні аднаго колькі-небудзь буйнага пачынання, лозунга, напрамку ў нашай палітыцы, аўтарам якога быў-бы не таварыш Сталін, а хто-небудзь іншы. Уся асноўная работа — гэта павінна ведаць партыя — праходзіць па ўказаннях, па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна.** Самыя вялікія пытанні міжнароднай палітыкі вырашаюцца па яго ўказанню, і не толькі гэтыя вялікія пытанні, але і, здавалася-б, трэцэрадныя і нават дзесяцірадныя пытанні цікавяць яго, калі яны датычаць рабочых, сялян і ўсіх працоўных нашай краіны.

Я павінен сказаць, што гэта мае дачыненне не толькі да будаўніцтва соцыялізма ў цэлым, але і да асобных пытанняў нашай работы. Напрыклад, калі ўзяць пытанні абароны нашай краіны, то трэба з усёй сілай падкрэсліць, што ўсімі нашымі поспехамі, аб якіх я гаварыў, мы палкам і поўнасцю абавязаны Сталіну.

Магутная воля, каласальны арганізатарскі талент гэтага чалавека забяспечылі партыі своечасовае правядзенне вялікіх гістарычных паваротаў, звязаных з пабеданосным будаўніцтвам соцыялізма».

Вось чаму такі вялікі ўплыў таварыша Сталіна, вялікая яго роля ў барацьбе за комунізм. Вось чаму так глыбока любоў да яго партыі, комсамола, працоўных СССР і іншых краін.

У дзень свайго пяцідзесяцігоддзя таварыш Сталін адказаў на шматлікія прывітанні з усіх канцоў свету: «Можаце не сумняваецца, таварышы, што я гатоў і надалей аддаць справе рабочага класа, справе пролетарскай рэволюцыі і сусветнага комунізма ўсе свае сілы, усе свае здольнасці і, калі патрэбна будзе, усю сваю кроў, каплю за каплей». І ўсе ведаюць, што гэтыя словы — з глыбіні сэрца таварыша Сталіна.

З глыбокай адданасцю партыі, Леніну, Комуністычнаму Інтэрнацыяналу, з глыбокім веданнем тэорыі марксізма-ленінізма таварыш Сталін спалучае вялікі арганізатарскі талент, які дае яму магчымасць ахапіць складанейшыя пытанні, зрабіць іх найбольш зразумелымі, простымі, блізкімі працоўным. Таварыш Сталін, як і Ленін, уладае ў дасканаласці майстэрствам рабіць тэорыю марксізма-ленінізма здабыткам мільёнаў.

Да гэтага трэба дадаць найвялікшую асабістую прастату і скромнасць ва ўсім таварыша Сталіна — у адзенні, у спосабах жыцця, у патрэбнасцях, у адносінах з людзьмі. Гэтую якасць скромнасці, якая ўпрыгожвае большэвіка, таварыш Сталін прывівае ўсім членам партыі, комсамолу. У духу гэтай скромнасці ён выхоўвае ўсіх нас.

«Сталін напісаў нямала кніг, і кніг выдатных. Многія з іх з'яўляюцца ў марксісцкай літаратуры класічнымі. Але калі яго запыталі, хто ён такі, ён адказаў: «Я толькі вучань Леніна і мая мэта — быць дастойным яго вучнем». (**Анры Барбюс**, «Сталін», стар. 349).

Таварыш Сталін любіць моладзь, любіць дзяцей. Ён пастаянна клапоціцца аб моладзі, аб яе комуністычным выхаванні, аб яе здароўі, фізічнай загартоўцы, аб тым, каб вырасцілі велаючых, адукаваных, чэсных, стойкіх барацьбітоў за комунізм. Сваім ростам, сілай свайго ўплыву комсамол у значнай ступені абавязан таварышу Сталіну. Вось чаму моладзь, вось чаму дзеці так любяць таварыша Сталіна, як свайго лепшага друга, бацьку, настаўніка, таварыша.

Таварыш Сталін сам працуе надзвычайна многа. Наўрад ці можна знайсці другога чалавека ў нашай краіне, які так многа працаваў-бы. Ён нярэдка працуе да 4 гадзін раніцы і пазней. Круг інтарэсаў яго бязмежны. Для справы народа, для перамогі комунізма ён не шкадуе сваіх сіл, як не шкадаваў сваіх сіл Ленін.

Анры Барбюс, які напісаў кнігу аб Сталіне, даў выдатны партрэт таварыша Сталіна:

«Калі праходзіш почту па Краснай плошчы, яе абшырная панарама нібы раздвайваецца: тое, што ёсць цяпер — радзіма ўсіх лепшых людзей зямнога шара, — і тое архаічнае, што было да 1917 года. І здаецца, што той, хто ляжыць у маўзалеі пасярод пустэльнай начной плошчы, астаўся зараз адзіным у свеце, хто не спіць; ён бодрствуе на усім, што распасціраецца вакол яго, — над гарадамі, над вёскамі. Ён — сапраўдны правадыр, чалавек, аб якім рабочыя гаварылі усміхаючыся ад радасці, што ён ім і таварыш, і настаўнік адначасова; ён — бацька і старэйшы брат, які сапраўды схіляўся над усімі. Вы не ведалі яго, а ён ведаў вас, ён думаў аб вас. Хто-б вы ні былі, вы маеце патрэбу ў гэтым другу. І хто-б вы ні былі, лепшае ў вашым лёсе знаходзіцца ў руках таго другога чалавека, які таксама бодрствуе за ўсіх і працуе, — чалавека з галавою вучонага, з тварам рабочага, у адзенні простага салдата» (**Анры Барбюс**, «Сталін», стар. 351—352. Дзяржлітвыдат. 1936).

Сталін дапамагае нам авалодаць майстэрствам дзяржаўнага кіравання і ўменнем працаваць. Адна з важнейшых адзнак гэтага ўмення — сувязь з масамі. Таварыш Сталін дае нам дасканалы ўзор адносін да мас, сувязі з імі. Ён не толькі вучыць гэтыя масы, ён вучыцца ў мас. І сувязь з масамі таварыш Сталін лічыць лепшай адзнакай сапраўднага большэвіка. Разам з тым гэтая сувязь з масамі, гэтая блізасць да мас нічога агульнага не мае з падладжваннем да іх. Прынцыповая непрымірымасць таварыша Сталіна — адна з важнейшых якасцей большэвіка — з'яўляецца важнейшым сродкам большэвіцкага выхавання. Таварыш Сталін вучыць нас гэтай большэвіцкай непрымірымасці да малейшых спроб сказіць вучэнне марксізма-ленінізма. Ён выхоўвае нас, як і Ленін, быць непрымірымымі і бязлітаснымі да ўсіх ворагаў комунізма.

Таварыша Сталіна ў песнях народаў песняры параўноўваюць з клапатлівым садоўнікам, які любіць свой сад, а гэты сад — чалавецтва. Самае каштоўнае, што ёсць у нас у грамадстве, — гэта людзі, гэта кадры. Клопаты аб людзях, клопаты аб кадрах, аб жывым чалавеку, — вось што пэніць народ у Сталіне, вось чаму мы павінны вучыцца ў таварыша Сталіна.

Пастаянная работа над тэорыяй марксізма-ленінізма выкавала ў таварыша Сталіна здольнасць глыбока аналізаваць складаныя грамадскія з'явы, здольнасць прадбачыць падзеі. **Пачуццё новага** ў таварыша Сталіна надзвычайна моцнае. Таму таварыш Сталін дае нам узор большэвіцкага прадбачання, бо без такога прадбачання нельга кіраваць, нельга накіроўваць вялікі совецкі карабль.

На перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы 11 снежня 1937 года таварыш Сталін гаварыў:

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны аставаліся на вышыні сваіх задач; каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацеляў; каб яны аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу; каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін; каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін; каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін; каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўчот усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін; каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін; каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Такі іменна таварыш Сталін. Ён заўсёды астаецца на пасту палітычнага дзеяча як верны ленінец. Ён заўсёды з'яўляецца такім-жа ясным і пэўным дзеячом, як Ленін. Ён заўсёды гэтак-жа бясстрашны ў баі і бязлітасны да ворагаў народа, як Ленін. Ён свабодны ад усякай панікі ў складанай абстаноўцы, калі краіне пагражае небяспека, ён свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін. Ён гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўчот усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін. Ён гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін. Ён гэтак-жа любіць свой народ, як любіў яго Ленін. Вось чаму і народ яму плаціць такой-жа любоўю. Народ любіць Сталіна, як ён любіў і любіць Леніна.

«Гісторыя яго жыцця, — пісаў Анры Барбюс, — гэта бесперапынны рад перамог над бесперапынным радам страшэнных труднасцей. Не было такога года, пачынаючы з 1917, калі ён не зрабіў-бы такіх дзеянняў, якія ўсякага праславілі-б назаўсёды. Гэта — жалезны чалавек. Прозвішча дае нам яго вобраз: Сталін — сталь. Ён незгібаемы і лёгкі, як сталь. Яго сіла — гэта яго непараўнаны здаровы сэнс, шырыня яго пазнаняў, здзіўляючая ўнутраная сабранасць, прагнасць да яснасці, няўмольная паслядоўнасць, быстрата, пвёдасць і сіла рашэнняў, пастаянны клопат аб падборы людзей.

Пасля смерці чалавек жыве толькі на зямлі. Ленін жыве ўсюды, дзе ёсць рэволюцыянеры. Але можна сказаць: ні ў кім так не ўвасоблены мысль і слова Леніна, як у Сталіне. Сталін — гэта Ленін сёння» (**Анры Барбюс**, «Сталін», стар. 343—344. Дзяржлітвыдат. 1936).

Народ склаў аб Сталіне любоўна свае песні. У гэтых песнях ён апявае Сталіна, як вызваліцеля прыгнечаных народаў, як мудрага кормчага, як зоркага і бясстрашнага горнага арла. У адной з песень горцаў Дагестана народ спявае:

«Идут за тобой
Миллионы людей, —
К большой высоте
Пролагаешь ты путь.
И тот, кто однажды
Пошел за тобой,
Скорее умрет,
Чем покинет твой путь!».

Маленькі лакскі народ спявае аб таварышу Сталіне:

«Реки стремятся к морю,
Железо стремится к магниту,
Травы стремятся к солнцу,
Птицы стремятся на юг.
А люди стремятся к счастью,
Они стремятся к правде,
Сердца их стоемятся к дружбе,
Мысли стремятся к тебе!».

На прыкладзе жыцця таварыша Сталіна вучацца і будуць вучыцца мільёны людзей. Вобраз Сталіна дапамагае прапоўным у іх барацьбе. Слова Сталіна натхняе на новыя працоўныя подвігі працоўных. Мысль Сталіна асвятляе далёка наперад наш шлях.

Ля вялікага совецкага карабля, які ідзе поўным ходам наперад, ля руля стаіць пад усёпераматаючым сцягам Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў вялікі кормчы, друг, настаўнік, правадыр народаў — таварыш Сталін.

Людзі Совецкага Саюза гаворацъ: дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае жыццё. Яго імя з павагаю і любоўю вымаўляюць мільёны людзей ва ўсіх краінах свету. Гэтае імя — сцяг вялікіх перамог комунізма, да светлых вяршын якога таварыш Сталін вядзе совецкі народ.

Ем. ЯРАСЛАЎСКІ.

Выстаўка, прысвечаная 60-годдзю са дня нараджэння таварыша Сталіна, арганізаваная Мінскім музеем рэволюцыі ў памяшканні Дома партактыва Мінгаркома КП(б)Б. НА ЗДЫМКУ: наведвальнікі аглядаюць выстаўку. Фото І. Казловіча.

СЕЛЬСОВЕТ НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

Свіславіцкі сельсовет, Асіпавіцкага раёна, сустракае дзень выбараў у мясцовыя советы буйнымі поспехамі ва ўсіх галінах палітычна-гаспадарчага і культурнага жыцця.

На тэрыторыі сельсовета знаходзіцца 8 калгасаў. Усе яны за апошнія годы непараўнальна ўмацаваліся гаспадарча і арганізацыйна. З кожным годам у іх павышаецца ўраджай, расце калгасны працадзень, паляпшаецца добрабыт калгаснікаў.

Характэрны ў гэтых адносінах калгас «Усход», які быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Сярэдні ўраджай збожжавых у гэтым калгасе ў 1938 годзе склаў 12,37 цэнтнера з гектара. Сёлета калгаснікі яшчэ больш павысілі ўраджай, дабіўшыся ў сярэднім з гектара 13,5 цэнтнера. Асобныя-ж стахановы далёка перавысілі і гэтыя паказальнікі. У звяне Дзмітрыя Феська, напрыклад, атрыман ураджай ячменю па 27,77 цэнтнера з гектара, у брыгадзе Аляксандра Кашко — па 25,8 цэнтнера пшаніцы з гектара.

Адпаведна росту ўраджайнасці на палях і прадуктыўнасці жывёлы на фермах, расце і вага працадня. Па папярэдніх падліках у гэтым годзе сям'я калгасніка Багдановіча, якая выпрацавала 750 працадзён, атрымае 2.625 кгр. збожжа, 7.500 кгр. бульбы, 1.500 кгр. гародніны, 4.500 кгр. фуражу і 1.500 рублёў грашыма. Не менш атрымаюць і сем'і калгаснікаў Сцяпана Яноўскага, Якава Балбаса і многіх іншых.

Заможнае і радаснае жыццё прышло ў хаты калгаснікаў. Карэнным чынам змянілася аблічча вёсак. У кожным калгасе вырасілі новыя гаспадарчыя пабудовы, добрыя жылыя дамы. Вялікія змены закранулі кожнае паселішча, кожны куток сельсовета.

Узяць хоць-бы сельсовецкі цэнтр — мястэчка Свіслач. Да вялікага Кастрычніка яно налічвала 800 жыхароў. З культурных устаноў у мястэчку мелася толькі адна пачатковая школа. За гоі тут былі дзве царквы, дзве сінагогі, касцёл і некалькі шынкоў. Тагочасная «інтэлігенцыя» мястэчка складалася з памешчыка, 10 гандляроў, 2 папоў, 2 равінаў, 2 ураднікаў, 8 стражнікаў, старасты і пісара. Насельніцтва-ж амаль усё было непісьменным.

Зараз у мястэчку налічваецца 1.700 жыхароў. 540 з іх з'яўляюцца калгаснікамі, астатнія працуюць у кааператыўных арцелях і частка — на шклозаводзе «Кастрычнік». У мястэчку ёсць 2 сярэднія, 2 няпоўныя сярэднія і 4 пачатковыя школы. Ёсць Дом соцкультуры, бібліятэка, больніца.

У сувязі з выбарамі ў мясцовыя советы сельсовет разбіт на 4 выбарчыя ўчасткі, створаны адна выбарчая акруга па выбарах у абласны совет, 8 акруг —па выбарах у раённы совет і 25—па выбарах у сельскі совет. У падрыхтоўку да выбараў уцягнута вялікая колькасць актывістаў, працуючых у якасці членаў участковых і акруговых выбарчых камісій, даверaных і агітатараў.

Непасрэдна ў калгасах і мястэчку працуюць больш 50 агітатараў. Гэта перадавыя людзі калгасаў, лепшыя прадстаўнікі інтэлігенцыі сельсовета. Яны нясуць у масы словы большэвіцкай праўды.

Адным з лепшых агітатараў нашага сельсовета з'яўляецца дырэктар сярэдняй школы тав. Гойлак — кіраўнік агітколектыва ў калгасе «Новая ніва». Тав. Гойлак ужо зрабіў пяць дакладаў выбаршчыкам па розных пытаннях, ажыццявіў работу комсамольскай арганізацыі. Ён карыстаецца заслужанай павагай сярод выбаршчыкаў.

У калгасе «Молат» агітатарам працуе комсамолец Міхаіл Бурак. Ён вельмі жыва праводзіць гутаркі з выбаршчыкамі, дэтальна вывучае з імі Выбарчы закон, на канкрэтных фактах расказвае ім аб перамогах у нашай краіне, аб кандыдатах у дэпутаты мясцовых советаў.

Вялікі аўтарытэт сярод выбаршчыкаў таксама заваявалі агітатары-калгаснікі Алесь Дайнека, Іосіф Багдановіч, Паўтаржыцкі і інш.

Калгаснікі Свіславіцкага сельсовета на сваіх перадвыбарчых сходах вылучылі найбольш дастойных людзей кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў. Калгасніца Марыя Кашко, якая з'яўляецца цяпер членам прэзідыума сельсовета, вылучана кандыдатам у дэпутаты Асіпавіцкага раённага совета. Знатныя калгаснікі Андрэй Кашко і Еўпакія Забоўская вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты сельскага совета. Старшыня калгаса «Усход», тав. Руды ўдастоіўся высокай чэсці быць вылучаным кандыдатам у дэпутаты Магілеўскага абласнога совета.

Ва ўсіх калгасах зараз разгорнута шырокая агітацыя за вылучаных кандыдатаў. Амаль кожнага з іх ужо добра ведаюць выбаршчыкі.

З самага пачатку выбарчай кампаніі калгаснікі сельсовета абавязаліся сустрэць дзень выбараў новымі вытворчымі поспехамі. Абавязацельствы ў асноўным выкананы. Калгасы ў тэрмін закончылі ўборку ўраджаю, копку бульбы і абмалот зернавых, датэрмінова выканалі абавязацельствы перад дзяржавай. Зараз заканчваецца работа па падліку працадзён і размеркаванню даходаў.

Да знамянальнага дня — 24 снежня — працоўныя Свіславіцкага сельсовета рыхтуюцца, як да вялікага таржаства.

М. БУРАК,
старшыня Свіславіцкага сельсовета.

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ І ПРЭМІРАВАННІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ

Пастанова Галоўнага Камітэта Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі

За выдатныя поспехі ў сельскай гаспадарцы і перавыкананне паказальнікаў, устаноўленых для ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, прысудзіць:

Па Мінскай вобласці

Дыплом 1-й ступені, прэмію дзесяць тысяч рублёў і легкавую аўтамашыну:

1. **Калгасу «Чырвоны партызан»**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 15,08 цэнтнера з гектара, бульбы 154,18 цэнтнера з гектара.

2. **Калгасу «1 мая»**, Слуцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 13,15 цэнтнера з гектара, бульбы 185,3 цэнтнера, капусты позняй 358 цэнтнераў, кармавых кораньплодаў 489 цэнтнераў з гектара: свінагадоўчая ферма калгаса атрымала і захавала 17,4 парасёнка на свінаматку; малочнатаварная ферма атрымала ўдой малака 1.588 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы і сярэднесутачную прывагу цялят да 6-месячнага ўзросту 625 грамаў на галаву, пры поўным захаванні маладняка.

3. **Калгасу «Чырвоны гароднік»**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 14,85 цэнтнера, капусты позняй 400,5 цэнтнера з гектара, агуркоў 365,5 цэнтнера, буракоў сталовых 478 цэнтнераў, морквы сталовай 302,5 цэнтнера, бульбы 172,2 цэнтнера з гектара.

4. **Свінагадоўчай таварнай ферме калгаса «Калінінск»**, Уздзенскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы 20 парасят на свінаматку.

5. **Соўгасу імені 10-годдзя БССР**, Любаньскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 16,24 цэнтнера з гектара; паўднёвых канапельсаломкі зеленца 55,1 цэнтнера з гектара.

6. **Соўгасу «Лошыца 1-я»**, Мінскага раёна, які атрымаў ураджай зернавых за 1937—1938 годы 17,45 цэнтнера з гектара і ўдой малака па ферме 2.692 літры на фуражную карову метысаў остфрыскай пароды.

Дыплом 2-й ступені, прэмію пяць тысяч рублёў і матацыкл:

1. **Слуцкаму дзяржаўнаму племянному рассаднику белых англійскіх свіней**, які дабіўся ў сярэднім за 1937—1938 годы атрымання і захавання ў абслугоўваемых ім калгасах па 11,4 парасёнка на свінаматку; з калгасаў дзейнасці рассадніка прадана племяннога маладняка 3.590 галоў, у тым ліку эліты і 1-га класа 2.221 галава.

2. **Слуцкай інкубатарнай птушкагадоўчай станцыі**, якая дабілася за 1937—1938 годы 81,8 процанта выхаду цыплят ад заложаных яек.

3. **Соўгасу «Рачковічы»**, Чырвонаслабодскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўдой малака 2.712 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы і метысаў остфрыскай пароды.

4. **Соўгасу «Чырвоны транспарт»**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 16,05 цэнтнера, буракоў сталовых 319,5 цэнтнера, агуркоў 291,1 цэнтнера, капусты ранняй 235,2 цэнтнера з гектара; ураджай пладу маладога плоданосячага сада 15,8 цэнтнера з гектара; па малочна-таварнай ферме атрымаўшаму ўдой малака 2.375 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

5. **Соўгасу «Залог пяцігодкі»**, Пухавіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай зернавых 15,69 цэнтнера з гектара; па малочна-таварнай ферме ўдой малака 1.922 літры на фуражную карову мясновай жывёлы.

6. **Калгасу імені Молатава**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай зернавых 12,92 цэнтнера з гектара і па малочна-таварнай ферме ўдой малака 1.866 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

7. **Калгасу імені Дзержынскага**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 14,06 цэнтнера, бульбы 180,3 цэнтнера з гектара.

8. **Калгасу «Чырвоныя Міхейкі»**, Слуцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 12,32 цэнтнера, бульбы 157,11 цэнтнера з гектара.

9. **Калгасу «Шлях Ільіча»**, Старадарожскага раёна, які атрымаў у 1938 г. ураджай сырых карэнняў кок-сагыза 22,56 цэнтнера з гектара і насення 72 кілограма з гектара.

10. **Калгасу «Чырвоная Рагатка»**, Барысаўскага раёна, які атрымаў у 1938 г. ураджай сырых карэнняў кок-сагыза 23,7 цэнтнера з гектара.

11. **Калгасу «Ільіч»**, Копыльскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай махоркі 37,58 цэнтнера з гектара.

12. **Калгасу імені Леніна**, Смалявіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 14,06 цэнтнера, бульбы 180,3 цэнтнера з гектара.

13. **Калгасу «Чырвоная Слабада»**, Барысаўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай хмелю 10,5 цэнтнера з гектара.

14. **Конегадоўчай таварнай ферме калгаса «Герой працы»**, Заслаўскага раёна, якая вырасціла ў сярэднім за 1937—1938 годы 94,7 жарабёнка на 100 конематак.

15. **Малочна-таварнай ферме калгаса «Чырвоны пуцілавец»**, Грэскага раёна, якая атрымала ўдой малака ў сярэднім за 1937—1938 годы 2.146 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

16. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Звязда»**, Заслаўскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы 171 ягня да адбіўкі на 100 аўцаматак і пакрытых ярак метысаў тонкаруннай пароды.

17. **Свінагадоўчай таварнай ферме калгаса «Комунар»**, Копыльскага раёна, якая атрымала і захавала ў сярэднім за 1937—1938 годы 17,4 парасёнка на свінаматку.

18. **Племяннай свінагадоўчай таварнай ферме калгаса імені Ульянава**, Копыльскага раёна, якая атрымала і захавала ў сярэднім за 1937—1938 годы 17,6 парасёнка на свінаматку: прадаўшы на племя 260 галоў маладняка, у тым ліку эліты і 1-га класа 150 галоў.

19. **Свінагадоўчай таварнай ферме калгаса «Чырвоная зорка»**, Старобінскага раёна, якая за 1937—1938 годы атрымала і захавала 17 парасят на свінаматку.

20. **Пасецы № 1 калгаса «Рэволюцыя»**, Слуцкага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы валавы збор мёду 66,8 кгр. і 0,925 кілограма воску на перазімаваўшую пчоласям'ю.

21. **Соўгасу імені Дзержынскага**, Копыльскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўдой малака 2.832 літры на фуражную карову розных парод і дабіўся выхаду і захавання 16 парасят на свінаматку.

22. **Калгасу імені АДПУ**, Мінскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ураджай: зернавых 11,65 цэнтнера, бульбы 175,85 цэнтнера; агуркоў 257,7 цэнтнера з гектара.

23. **Калгасу «Іскра Леніна»**, Чырвонаслабодскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы зернавых 12,78 цнт. з гектара, бульбы 224,4 цэнтнера з гектара.

24. **Конегадоўчай таварнай ферме калгаса «Звязда»**, Заслаўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 95 жарабят на 100 конематак.

25. **Калгасу «Новы шлях»**, Мінскага раёна, які пабудаваў гідраэлектрастанцыю.

Па Віцебскай вобласці

Дыплом 1-й ступені, прэмію дзесяць тысяч рублёў і легкавую аўтамашыну:

1. **Боркавіцкай МТС**, Дрысенскага раёна, якая дабілася ў 1937—1938 годах ў абслугоўваемых ёю калгасах ураджаю ільнотрасты 12,63 цэнтнера з гектара, выпрацоўкі на 15-сільны калёсны трактар 541 гектара, выканаўшы план трактарных работ на 104,5 процанта.

2. **Калгасу «Барацьбіт»**, Талачынскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ўраджай: ільновалакна 4,66 цэнтнера з гектара, канюшыннага сена 42,5 цэнтнера з гектара: захаваўшаму па свінагадоўчай таварнай ферме 19,6 парасёнка на свінаматку.

Дыплом 2-й ступені, прэмію пяць тысяч рублёў і матацыкл:

1. **Насеннаводчаму соўгасу «Мемзва»**, Аршанскага раёна, які атрымаў у 1937—1938 годах у сярэднім ураджай зернавых 14,03 цэнтнера з гектара.

2. **Калгасу «Ларынаўка»**, Аршанскага раёна, які захаваў у 1937—1938 годах 98,4 процанта дрэў маладога непладаносячага сада пры сярэднім прыросце 50 сантыметраў.

3. **Калгасу імені Леніна**, Гарадоцкага раёна, які атрымаў у 1937—1938 годах у сярэднім ураджай: зернавых 12,03 цэнтнера, бульбы 148,07 цэнтнера з гектара; па малочна-таварнай ферме ў сярэднім за два годы сярэднесутачную прывагу цялят мясновай жывёлы да 6-месячнага ўзросту 550 грамаў на галаву.

4. **Калгасу «Ленінскі прызыў»**, Сіроцінскага раёна, які пабудаваў гідраэлектрастанцыю.

5. **Калгасу «Перамога»**, Талачынскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай бульбы 157,36 цэнтнера з гектара.

6. **Калгасу «Рабочы шлях»**, Полацкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 11,5 цэнтнера, бульбы 154 цэнтнеры з гектара і па аўцагадоўчай таварнай ферме 193 ягнят да адбіўкі на 100 матак пакрытых ярак пароды мерынос.

7. **Калгасу імені Сако і Ванцэці**, Асейскага раёна, які атрымаў па свінагадоўчай таварнай ферме ў сярэднім за 1937—1938 годы 20,55 парасёнка на свінаматку і па аўцагадоўчай таварнай ферме 230 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак метысаў пароды мерынос.

8. **Калгасу імені Чапаева**, Чашніцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай канюшыннага сена 11,13 цэнтнера, ільновалакна 4,13 цэнтнера з гектара.

9. **Калгасу «Чырвоныя Кубы»**, Аршанскага раёна, які атрымаў па свінагадоўчай таварнай ферме ў сярэднім за 1937—1938 годы 19,3 парасяці на свінаматку і па аўцагадоўчай таварнай ферме 201 ягня да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак метысаў цыгайскай пароды.

10. **Калгасу «Чырвонае Лучно»**, Полацкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай зернавых 13,06 цэнтнера з гектара.

11. **Калгасу «Чырвоны пуцілавец»**, Талачынскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: ільновалакна 4,02 цэнтнера, канюшыннага сена 46,88 цэнтнера з гектара.

12. **Калгасу «Яўна-дзіве»**, Лёзнянскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ўраджай зернавых 11,4 цэнтнера з гектара, па малочна-таварнай ферме ўдой малака 1.656 літраў у сярэднім на фуражную карову мясновай жывёлы.

13. **Конгадоўчай таварнай ферме калгаса імені Карла Маркса**, Багушэўскага раёна, якая вырасціла ў сярэднім за 1937—1938 годы 95,5 жарабя на 100 конематак.

14. **Малочна-таварнай ферме калгаса «Трэці Інтэрнацыянал»**, Лёзнянскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўдой малака 1.595 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

15. **Свінагадоўчай таварнай ферме калгаса «Памяць Ільіча»**, Расонскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 19,5 парася на свінаматку.

16. **Свінагадоўчай таварнай ферме калгаса «Палітаддзелец»**, Бешанковіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 19,1 парася на свінаматку.

17. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса імені Пушкіна**, Лёзнянскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 150 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак пароды аксфорд і настрыг шэрсці 5,638 кілограма на дарослую авечку.

18. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Чырвоны сейбіт»**, Асвейскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 236 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак метысаў цыгайскай пароды і настрыг шэрсці 3,63 кілограма на дарослую авечку.

19. **Соўгасу «І мая»**, Дубровенскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ўдой малака ў сярэднім 2.500 літраў на фуражную карову метысаў швіцкай пароды.

20. **Калгасу «Брыгадзір»**, Аршанскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 5,59 цэнтнера з гектара.

21. **Калгасу імені Чырвонай Арміі**, Віцебскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ў сярэднім ураджай: зернавых 12,86 цэнтнера, капусты 526,6 цэнтнера, буракоў сталовых 361,5 цэнтнера з гектара.

22. **Калгасу «Юны мір»**, Дрысенскага раёна, які атрымаў за 1937—1938 годы ў сярэднім ураджай ільносемя з разраджаных пасеваў 4,57 цэнтнера з гектара.

Па Магілеўскай вобласці

Дыплом 1-й ступені, прэмію дзесяць тысяч рублёў і легкавую аўтамашыну:

1. **Калгасу «2-я пяцігодка»**, Магілеўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 6,25 цэнтнера з гектара.

2. **Калгасу імені Куйбышэва**, Бабруйскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: бульбы 160,9 цэнтнера, морквы сталовай 269 цэнтнераў, агуркоў 305,7 цэнтнера, буракоў сталовых 368,9 цэнтнера, кармавых кораньплодаў 363,3 цэнтнера з гектара; па малочна-таварнай ферме атрымаўшаму ўдой малака 1.925 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

3. **Племсоўгасу «Цімакава»**, Клімавіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 16,5 парася на свінаматку; ураджай зернавых 11,23 цэнтнера з гектара; пладу з плоданосячага сада 95,35 цэнтнера з гектара.

Дыплом 2-й ступені, прэмію пяць тысяч рублёў і матацыкл:

1. **Соўгасу «Буйнічы»**, Магілеўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай зернавых 14,23 цэнтнера з гектара.

2. **Соўгасу «Вайнілы»**, Чавускага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўдой малака 2.450 літраў на фуражную карову метысаў швіцкай пароды і дабіўся таксама рэалізацыі свінапрадукцыі 1.030 кілограмаў на свінаматку.

3. **Конзаводу № 95**, Магілеўскага раёна, які вырасціў у сярэднім за 1937—1938 годы 91,2 жарабя на 100 конематак, па малочнай ферме дабіўся ўдою малака 2.088 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы.

4. **Калгасу «Сцяг працы»**, Чэрыкаўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай насення канюшыны 4 цэнтнеры з гектара.

5. **Калгасу «Чырвоны Настрычнік»**, Круглянскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 4,3 цэнтнера, зернавых 11,3 цэнтнера з гектара.

6. **Калгасу «Ленінскі шлях»**, Шклоўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 11,26 цэнтнера, бульбы 152,6 цэнтнера з гектара і здаў дзяржаве насення ільну 5,29 цэнтнера з гектара.

7. **Калгасу «Перамога»**, Горацкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 4,7 цэнтнера з гектара.

8. **Калгасу «І мая»**, Касцюковіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы па аўцагадоўчай таварнай ферме на 100 матак метысаў пароды прэкос 136 ягнят; па свінагадоўчай таварнай ферме 15,6 парася на свінаматку.

9. **Калгасу «Свабода»**, Круглянскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: ільновалакна 4,24 цэнтнера, зернавых 12 цэнтнераў з гектара.

10. **Калгасу імені Сталіна**, Горацкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 4,38 цэнтнера з гектара.

11. **Калгасу «III Інтэрнацыянал»**, Асіпавіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай бульбы 175 цэнтнераў з гектара.

12. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Чырвоны ўсход»**, Кіраўскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы на 100 аўцаматак метысаў цыгайскай пароды 232 ягнят і настрыг шэрсці 4,30 кілограма на дарослую авечку.

13. **Пасецы ўчгаса** Горацкага сельгасінстытута, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы мёду 52 кілограмы і воску 1,35 кілограма на перазімаваўшую пчоласям'ю.

14. **Калгасу «Шлях да соцыялізма»**, Горацкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай ільновалакна 4,24 цэнтнера з гектара.

Па Палескай вобласці

Дыплом 1-й ступені, прэмію дзесяць тысяч рублёў і легкавую аўтамашыну:

1. **Калгасу «Совецкая Беларусь»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 16,42 цэнтнера, бульбы 197,62 цэнтнера з гектара.

2. **Калгасу «13-ы Настрычнік»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 15,7 цэнтнера, бульбы 201,85 цэнтнера з гектара.

Дыплом 2-й ступені, прэмію пяць тысяч рублёў і матацыкл:

1. **Рыбнаму соўгасу «Белае»**, Жытковіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 175 кілограмаў таварнага карпа з гектара прудоў.

2. **Соўгасу імені Молатава**, Камарынскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўдой малака 2.078 літраў на фуражную карову мясновай жывёлы і вырасціў 294 цяля з сярэднесутачнай прывагай да 6-месячнага ўзросту 696 грамаў на галаву.

3. **Калгасу «X з'езд Совецкаў»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 13,17 цэнтнера, бульбы 164,75 цэнтнера з гектара.

4. **Калгасу імені Калініна**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 14,56 цэнтнера, бульбы 153,12 цэнтнера з гектара.

5. **Калгасу «Новае жыццё»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 13,44 цэнтнера, бульбы 164 цэнтнера з гектара.

6. **Калгасу «III рашаючы»**, Глускага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай канюшыннага сена 59 цэнтнераў з гектара.

7. **Калгасу «Праца»**, Хойніцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 15,1 цэнтнера, махоркі 24,17 цэнтнера з гектара.

8. **Калгасу «Чырвоны пуцілавец»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 12,44 цэнтнера, бульбы 156,4 цэнтнера з гектара.

9. **Калгасу «XVI партыйны з'езд»**, Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай: зернавых 13,41 цэнтнера, бульбы 211,56 цэнтнера з гектара.

10. **Малочна-таварнай ферме калгаса «Чырвоная Украіна»**, Камарынскага раёна, якая вырасціла ў сярэднім за 1937—1938 годы 98 цялят мясновай жывёлы з сярэднесутачнай прывагай да 6-месячнага ўзросту 770 грамаў на галаву.

11. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Дзень калектывізацыі»**, Камарынскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы на 100 аўцаматак метысаў пароды прэкос 129 ягнят.

Па Гомельскай вобласці

Дыплом 2-й ступені, прэмію пяць тысяч рублёў і матацыкл:

1. **Калгасу «XIII год Настрычніка»**, Рагачоўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай барней кок-сагыза 25 цэнтнераў з гектара.

2. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Гомельскі пролетарый»**, Лоеўскага раёна, якая ў сярэднім за 1937—1938 годы атрымала 120 ягнят да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак метысаў пароды прэкос.

3. **Соўгасу імені Ланге**, Добрушскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы малака 1.834 літры на фуражную карову мясновай жывёлы.

4. **Калгасу імені Калініна**, Рэчыцкага раёна, які захаваў у сярэднім за 1937—1938 годы 96 процантаў дрэў маладога непладаносячага сада пры сярэднім прыросце 45 сантыметраў.

5. **Калгасу «Чырвоная Уза»**, Гомельскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы ўраджай бульбы 186,15 цэнтнера з гектара.

6. **Малочна-таварнай ферме калгаса «Чырвоны хлебароб»**, Гомельскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы малака 1.755 літраў на фуражную карову метысаў остфрыскай пароды і мясновай жывёлы.

7. **Малочна-таварнай ферме калгаса «Чырвоны працаўнік»**, Гомельскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы малака 1.735 літраў на фуражную карову метысаў остфрыскай пароды і мясновай жывёлы.

8. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Чырвоны Луч»**, Буда-Кашалёўскага раёна, якая атрымала ў сярэднім за 1937—1938 годы па атары авечак метысаў цыгайскай пароды 200 ягнят да адбіўкі па 100 матак і пакрытых ярак.

9. **Аўцагадоўчай таварнай ферме калгаса «Абарона»**, Добрушскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы 184 ягня да адбіўкі на 100 матак і пакрытых ярак метысаў цыгайскай пароды.

10. **Пасецы калгаса «Севастопальскі металіст»**, Свяцілавіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—1938 годы валавы збор мёду 68 кілограмаў і воску 1,5 кілограма на перазімаваўшую пчоласям'ю.

11. **Конегадоўчай таварнай ферме калгаса імені Леніна**, Гомельскага раёна, якая вырасціла ў сярэднім за 1937—1938 годы 82,7 жарабя на 100 конематак.

ГАЛОЎНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ

Да адкрыцця Гомельскага абласнога рускага драматычнага тэатра. НА ЗДЫМКУ: сцэна з 4-га акта п'есы «Рэвізор» Н. В. Гогаля. Артыст П. Г. Чарноў у ролі Хлестакова (справа) і артыст К. І. Маслаў у ролі Землянікі.

Сёння адкрываецца Гомельскі абласны рускі драматычны тэатр

Сёння ў Гомелі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё рускага абласнога драматычнага тэатра. Факт адкрыцця ў БССР новага тэатра — сведчанне велізарных клопатаў партыі і ўрада аб далейшым росквіце социялістычнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Гомельскі рускі абласны драматычны тэатр у асноўным укамплектаван з маладых актораў—выпускнікоў маскоўскага Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імені А. В. Луначарскага. Іх непасрэдным настаўнікам быў вядомы рэжысёр-педагог народны артыст СССР, двойчы ордэнаносец Л. М. Леанідаў.

Калектыў маладога тэатра налічвае 35 творчых работнікаў, з іх 32 акторы, мастацкі кіраўнік і 2 рэжысёры. У яго рэпертуары ёсць такія класічныя творы, як «Рэвізор» — Н. Гогаля, «Васса Железнова» — М. Горкага і «Чайка» — А. Чэхава.

Апрача таго, творчы калектыў хутка пакажа гледачу п'есы совецкіх драматургаў «Пань Серебряная» — Н. Пагодзіна і «Хто смяецца апошнім» — К. Крапівы.

Сёння, ў дзень урачыстага адкрыцця, тэатр пакажа гомельскаму гледачу сваю першую прэм'еру — бяссмертную камедыю Н. Гогаля «Рэвізор».

Рэдакцыя газеты «Звязда» горача вітае ўсіх творчых работнікаў новага тэатра і жадае ім вялікіх поспехаў у стварэнні выдатных вобразаў і спектакляў.

Гомель.

Калектыву Абласнога рускага драматычнага тэатра

Дзякую за запрашэнне прыехаць на адкрыццё абласнога рускага драматычнага тэатра. Па ўмовах работы пазбаўлен магчымасці скарыстаць ваша запрашэнне. Жадаю ўсяму калектыву вялікіх творчых поспехаў у славу совецкага мастацтва, на карысць працоўных нашай вялікай радзімы.

Нам. Старшыні СНК СССР.
А. ВЫШЫНСКІ.

Гомель.

Абласны рускі драматычны тэатр

Мастацкаму кіраўніку Сокалаву

Перадайце ўсяму калектыву мае сардэчныя віншаванні. Дысцыпліна, самакрытыка, социялістычнае спаборніцтва— вось што робіць трупу здольнай, моцнай. Упэўнен, што вы апраўдаеце давер'е, аказанае вам партыйнымі, грамадскімі і совецкімі арганізацыямі.

Прывітанне.

Народны артыст СССР Л. ЛЕАНІДАЎ.

Гомель.

Абласному рускаму драматычнаму тэатру

Сардэчна віншую малады калектыў Гомельскага рускага драматычнага тэатра. У дзень адкрыцця жадаю вам, дарагія таварышы, доўгіх год ратаснай творчасці, вялікіх, яркіх поспехаў.

Народны артыст СССР В. КАЧАЛАЎ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ПЕДАГОГІКІ

Днямі ў Мінску адбылася Усебеларуская канферэнцыя выкладчыкаў педагогікі педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел работнікі Упраўлення вышэйшай школы Наркамасветы БССР, а таксама прафесары маскоўскіх вышэйшых навучальных устаноў тт. Смірноў, Рывес, прафесар Кіеўскага педінстытута тав. Дадэнка.

Канферэнцыя шырока абмеркавала шляхі ўзняцця якасці падрыхтоўкі настаўнікаў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў у святле рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), пытанні арганізацыі вучэбнай работы па курсу педагогікі і яе гісторыі, і аб пастаноўцы практычных заняткаў па педагогіцы.

Дакладчыкі і выступіўшыя ў спрэчках таварышы адзначылі, што педагагічныя ВНУ Беларусі яшчэ па-сапраўднаму не змагаюцца за выкананне гістарычных пастаноў партыі і ўрада аб школе, за ўзняцце якасці заняткаў.

Да гэтага часу кафедры педагогікі ў педагагічных ВНУ не з'яўляюцца вядучымі. Яны ў дастатковай меры не ўзбройваюць студэнтаў — будучых настаўнікаў глыбокімі ведамі педагогікі, методыкі выкладання, не прывіваюць ім навыкаў работы над сабой і ўзораў культуры і дысцыпліны.

Кафедры педагогікі інстытутаў адарваны ад школы. Выкладчыкі прафіліруючых дысцыплін не бываюць у школах, слаба ведаюць школьны курс прадмета, не падагульняюць вопыт работы майстраў педагагічнага працэса. Педпрактыка студэнтаў часамі праходзіць пад кіраўніцтвам метадыста без удзелу прадстаўніка кафедры педагогікі.

Многа ўвагі канферэнцыя аддала пытанням знешняй культуры студэнта і культуры яго мовы. Для гэтага канферэнцыя выказалася за ўвядзенне ў педінстытутах, на ўсіх факультэтах курса методыкі выразнага чытання, расказвання і бясед.

На канферэнцыі прафесары Масквы і Кіева сумесна з навукова-педагагічным саставам педагагічных ВНУ Беларусі намецілі рад практычных мерапрыемстваў па ўзняццю якасці навучання ў ВНУ і выхавання высокакваліфікаваных педагогаў для сярэдняй школы.

А. МІНЬКОЎ.

АРГАНІЗАВАНА СУСТРЭЧ ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ Ў ШКОЛАХ

Засталіся лічаныя дні да пачатку зімовых канікул у школах. 30 снежня тысячы дзяцей нашай радзімы пасля поўгадавой вучобы атрымаюць заслужаны адпачынак.

Цікавыя і разнастайныя мерапрыемствы вызначаны на гэтыя дні ў Мінску. Гарадскія кінотэатры, клубы, стадыёны, прадастаўляюцца ў распараджэнне дзяцей. З мэтай найлепшага спалучэння культурнага абслугоўвання з выхаваўчай работай, школы, якія маюць паміж сабой социялістычныя дагаворы, правядуць падагульненне вынікаў спаборніцтва. 5 студзеня ў Тэатры оперы і балета адбудзецца атульнагаралскі злёт выдатнікаў вучобы. На злёце будзе вылучана далегацыя выдатнікаў, якая паедзе на экскурсію ў горад Беласток.

Распачалася падрыхтоўка да зімовых канікул і ў мінскім Палацы піянераў і акцябрат. Памяшканне прымае святочны выгляд. Лозунгі, плакаты, транспаранты, гірлянды рознакаляровых кветак пакрыюць сцены Палаца. Усё афармленне будзе правядзена на тэмы казак і вершаў рускіх пісьменнікаў і паэтаў: А. Пушкіна, А. Некрасава, І. Крылова і інш. У светлым фізкультурным зале Палаца будзе ўстаноўлена новагодняя ёлка.

Гарачая падрыхтоўка разгарнулася ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Яны рыхтуюцца ў часе зімовых канікул паказаць наведвальнікам Палаца многа мастацкіх канцэртаў. Драматычны гурток рыхтуе цікавую дзіцячую п'есу «Снежная каралева». Музыкальныя гурткі вывучаюць новыя песні аб нашай шчаслівай радзіме, гераічнай Чырвонай Арміі, аб вялікім Сталіне і першым Маршале Варашылаве.

Любяць дзеці гераічнасць і мужнасць совецкіх людзей. У Палацы будзе наладжана некалькі сустрэч вучняў з ордэнаносцамі — стаханаўцамі чыгункі, прадпрыемстваў, социялістычных палёў, з будучымі ўдзельнікамі дэкады Беларускага мастацтва ў Маскве, з пісьменнікамі, дэпутатамі Вярхоўных Совецтаў СССР і БССР.

Рыхтуецца спецыяльны вечар бацькоў. На ім дзеці пакажуць поспехі сваёй работы ў Палацы на працягу паўгодзя. Для вучняў младшых класаў будзе праведзена «свята цацак». Вучнямі старшых класаў арганізуюцца тры ілюмінаваныя карнавалы на тэму «Сталінская дружба народаў».

Піянеры Палаца запрасілі да сябе ў госці дзяцей навакольных вёсак, паасобных раёнаў Мінскай вобласці, а таксама дзяцей горада Беластока. Дзеці сталіцы БССР падрыхтавалі сваім гасцям многа каштоўных падарункаў.

На працягу зімовых канікул Палац піянераў і акцябрат мяркуе абслужыць больш 13 тысяч дзяцей.

П. СТАРАВЫБАРНЫ.

ЗА РУБЯЖОМ

ВАЙНА Ў ЕЎРОПЕ

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

ПАРЫЖ, 19 снежня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора ў раёне Вагезоў адбыўся бой паміж французскім разведчым атрадам і нямецкімі часцямі. Узята ў палон некалькі немцаў, сярод іх — два афіцэры.

БЕРЛІН, 19 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай армії паведамляе, што на заходнім фронце — нязначная мясцовая дзейнасць разведчых атрадаў і артылерыі.

ПАРЫЖ, 19 снежня. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што з пачатку вайны англійскі паветраны флот страціў 520 чалавек.

ПЕРШЫ БУЙНЫ БОЙ ПАМІЖ ГЕРМАНСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫЯЙ

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што сёння ў паветраным баі, які адбыўся паміж германскімі знішчальнікамі і англійскімі бамбардыроўшчыкамі, было збіта 34 англійскія самалёты. У спецыяльна апублікаванай у сувязі з гэтым зводцы гаворыцца:

У 14 гадзін 30 мінут 18 снежня на адным з аэрадромаў Паўночнай Германіі раптам быў дан сігнал паветранай трывогі. Паказаліся англійскія бамбардыроўшчыкі. Самалёты пранёўніка набліжаліся да германскага берага на вялікай вышыні. Тут іх сустрэлі нашы знішчальнікі. Многія варожыя бамбардыроўшчыкі былі збіты агнём знішчальнікаў, другія павярнулі назад і затым зноў атакавалі нашы самалёты.

Пасля паветранага бою, які працяваўжаўся на працягу 2 гадзін, самалёты пранёўніка былі абагнаны. У рэзультаце бою знішчаны 34 англійскія бамбардыроўшчыкі.

***

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі паведамляе, што ўчора эскадрылля англійскіх бамбардыроўшчыкаў, якая рабіла разведчы палёт у раёне Гельгаландскай бухты, сустрэла буйнае злучэнне германскіх знішчальнікаў. У рэзультаце жорсткага паветранага бою было збіта 12 германскіх самалётаў маркі «Месершміт», 7 англійскіх бамбардыроўшчыкаў не вярнуліся на свае базы.

ПАЕЗДКА ЧЭМБЕРЛЕНА НА ЗАХОДНІ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 19 снежня. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што англійскі прэм'ер-міністр Чэмберлен, які прыбыў днямі на самалёце ва Францыю, наведаў часць англійскага экспедыцыйнага корпуса і аглядаў англійскі сектар фронта ў Латарынгіі. Учора раніцой Чэмберлен прыехаў на лінію Мажыно, дзе Гамелен паказваў яму ўмацаванні. Затым Чэмберлен правёў агляд англійскага пяхотнага батальёна і батарэі французскай артылерыі.

ВАЙНА НА МОРЫ

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Па паведамленню германскага інфармацыйнага бюро, германскія самалёты дасягнуўшы Шэтландскіх астравоў і Портсмута, атакавалі вартавыя і нафтаналіўныя караблі, а таксама берагавыя кацеры пранёўніка. Некалькі суднаў было пашкоджана, 4 патоплена. Акрамя таго, германскія самалёты бамбардыравалі караван гандлёвых параходаў, які ішоў у суправаджэнні ваенных караблёў. У самым пачатку бамбардыроўкі параходы разышліся ў розныя бакі.

ЛОНДАН, 18 снежня. (ТАСС). Па вестках агенцтва Рэйтэр, з 10 па 16 снежня патоплена 7 англійскіх параходаў агульным водазмяшчэннем у 22.727 тон і 11 суднаў нейтральных дзяржаў агульным водазмяшчэннем у 20.244 тоны. Саюзным флотам захвачана 2 германскія параходы агульным водазмяшчэннем у 7.920 тон.

КАМАНДА ЛІНКОРА „АДМІРАЛ ГРАФ ШПЕЕ" УЗАРВАЛА І ЗАТАПІЛА КАРАБЛЬ

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Газеты апублікавалі наступнае паведамленне германскага інфармацыйнага бюро:

— Уругвайскі ўрад не прадставіў лінкору «Адмірал граф Шпее» неабходнага часу для рамонту. З прычыны гэтага Гітлер загадаў капітану Ланглорфу самому знішчыць карабль шляхам узрыву. Загад быў выкананы па-за ўругвайскімі тэрытарыяльнымі водамі.

ПАРЫЖ, 18 снежня. (ТАСС). Гавас паведамляе з Монтэвідэо, што лінкор «Адмірал граф Шпее», вышаўшы з порта Монтэвідэо, устаў на якар у пяці кілометрах ад берагу. Затым ён быў узарваны і патоплены сваёй камандай. Недалёка ад месца патаплення лінкора знаходзілася германскае нафтаналіўное судно «Такома» і два аргентынскія ваенныя караблі. Экіпаж лінкора падабраў судном «Такома». Лодка з аргентынскага ваеннага карабля ўзяла на борт камандзіра і афіцэраў лінкора.

***

Лінкор «Адмірал граф Шпее» з'яўляўся навейшым з трох германскіх карманных лінкораў (два іншыя — «Дэйчланд» і «Адмірал Шэер»). Ён закончан пабудовай у студзені 1936 года. Яго скорасць — 26 вузлоў, водазмяшчэнне — 10 тысяч тон, каманда — 926 чалавек. На ўзбраенні лінкора было шэсць 11-дзюймовых гармат, восем—5,9-дзюймовых гармат, 14 зенітных гармат. На борту яго знаходзіліся 2 самалёты. Пабудова лінкора абышлася ў 3 млн., 750 тыс. фунтаў стэрлінгаў.

***

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Буэнос-Айрэс, што камандзір германскага карабля «Адмірал граф Шпее» з афіцэрамі і ўсёй камандай прыбылі сёння ў Буэнос-Айрэс на двух аргентынскіх параходах. Як паведаміў капітан, уся каманда карабля выратавана.

***

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што ўрад Германіі заявіў рашучы пратэст уругвайскаму ўраду супроць адмаўлення ўругвайскіх улад прадаставіць германскаму лінкору «Адмірал граф Шпее» неабходны для рамонту час, падкрэсліўшы, што гэтым бесспрамонна парушана міжнароднае права і звычай аказання дапамогі суднам, папярэўшым аварыю.

Хроніка

Указам ад 17 снежня г. г. Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР назначыў тав. Пушкіна Г. М. поўнамоцным прадстаўніком Саюза ССР у Славакіі.

МІТЫНГ САЛІДАРНАСЦІ З СОВЕЦКІМ САЮЗАМ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 19 снежня. (ТАСС). 17 снежня ў Бірмінгаме адбыўся мітынг, у якім прымала ўдзел 3.000 чалавек. На мітынгу выступіў вядомы прафесар Холдэйн. Удзельнікі мітынга адобрылі палітыку Совецкага Саюза.

Паход супроць комуністычных газет у Швецыі

Шведскае міністэрства юстыцыі прадявіла адказнаму рэдактару шведскай комуністычнай газеты «Ню даг» абвінавачанне ў нарушэнні закона аб свабодзе друку. Повадам, як указвае газета «Дагено нюхетэр», з'яўляецца артыкул аб Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, змешчаны ў газеце «Ню даг». Аналагічнае абвінавачанне прад'яўлена таксама комуністычнай газеце «Арбетар тыднінген», якая выдаецца ў Гетэборгу.

Пасля таго, як было аб'яўлена аб «злачынствах» газеты «Ню даг» і «Арбетар тыднінген», аб'яднанне камісіянераў саюза выдавецтваў шведскіх газет прапанавала арганізацыям, якія распаўсюджваюць газеты, устрымацца ад продажу «Ню даг» і «Арбетар тыднінген». 18 снежня. (ТАСС).

Адкрыццё літоўскага універсітэта ў Вільна

КАУНАС, 18 снежня. (ТАСС). Да апошняга часу ў Вільна існаваў польскі універсітэт, які ператварыўся ў аплот з цэнтраў антылітоўскай дзейнасці, у прытулак для афіцэраў былой польскай армії. «Студэнты» не мелі нічога агульнага з навукай. Ва універсітэце яны выпускалі лістоўкі, адозвы, хавалі зброю. З трох тысяч студэнтаў было не больш 300—400 пастаянных жыхароў Віленскага края. Учора гэты універсітэт быў афіцыяльна перадан літоўскаму міністэрству асветы. Ва універсітэт у бліжэйшыя дні выязджаюць з Каўнаса каля 100 літоўскіх выкладчыкаў і вучоных. У Вільна будуць пераведзены таксама 3 факультэты з каўнаскага універсітэта: юрыдычны, гуманітарны і філасофскі.

НА ФРАНТАХ КІТАЯ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

Кітайскія войскі прадаўжаюць наступленне ў радзе раёнаў, размешчаных на поўдзень ад ракі Янцзы. Прасоўванне кітайскіх часцей праходзіць асабліва паспяхова на поўначы правінцыі Хунань, у паўднёвай частцы правінцыі Хубэй, правінцыях Цзянсі, Аньхуэй і Чжэцзян.

У сектары Суйчжоу-Іншань (на паўночны захад ад Ханькоу) кітайскія часці выбілі японцаў з некалькіх пунктаў. У раёне Іншань-Аньлу японцы сканцэнтравалі каля 10.000 салдат.

У паўночнай частцы правінцыі Хунань перадавыя кітайскія часці прарвалі лінію японскай абароны на поўнач ад Іючжоу.

У правінцыі Цзянсі баі адбываюцца ў раёне Наньчана і Уніна.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

17 снежня кітайскія войскі двума калонамі атакавалі Кайфын (правінцыя Хэнань). Бой цягнуўся ўсю ноч, часта пераходзячы ў рукапашныя схваткі. К раніцы кітайцы занялі паўднёвыя і заходнія вароты горада. У баі знішчана 200 японцаў і раззброен змешаны батальён 1-й японскай дывізіі. У апошнія два дні кітайскія часці занялі Туйсюй (на паўднёвы ўсход ад Кайфына).

КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР

У заходніх абласцях БССР ідзе вялікае культурнае будаўніцтва. Народ, які не меў пры польскіх панах ніякіх правоў, жыў у пемры, скінуў з сябе ланцугі рабства, будуе сваю новую сацыялістычную культуру. Кожны дзень з гарадоў і сёл, з самых аддаленых куткоў заходніх абласцей паступаюць паведамленні аб новых дасягненнях у культурным будаўніцтве. Пры вілейскай гімназіі створана першая дзіцячая тэхнічная станцыя. Тут ёсць фоталабараторыя, гурткі — авіямадэльны, радыё і інш. У гор. Ашмяны будуецца Дом сацыялістычнай культуры. Гэта будзе прыгожы двухпавярховы будынак з глядзельнай залай на 500 месц, з залай для пасяджэнняў, 8 пакоямі для работы гурткоў. У мястэчку Дзятлава, Новагрудскага павета, адкрылася новая бібліятэка, якая мае ўжо больш 3.000 кніг. У вёсках Негневіцкай воласці, гэтага-ж павета, уноў адкрыта 12 Дамоў сацыялістычнай культуры, у Баранавіцкім павеце будуюцца 14 школ. У гор. Гродна арганізавана 16 дзіцячых дамоў і садоў. У Пінску ў новым дзіцячым доме памешчана 100 сірот. Дзеці жывуць у добрых, светлых пакоях і акружаны клапатлівым доглядам.

З пачатку 1940 года ў заходніх абласцях арганізуюцца першыя вышэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы. Адкрываюцца педагагічны інстытут у Беластоку з факультэтамі — фізіка-матэматычным, мовы і літаратуры, замежных моў і геаграфічным; настаўніцкія інстытуты — у Гродна з факультэтамі фізіка-матэматычным, літаратурным і гістарычным, у Пінску — з факультэтамі літаратуры, фізіка-матэматычным і прыродазнаўча-геаграфічным і ў Баранавічах — з факультэтамі гістарычным і літаратурным.

Апрача таго, адкрыюцца 6 педагагічных вучылішчаў у Беластоку, Брэсце, Гродна, Маладзечна, Новагрудку і Пінску і два дашкольныя педагагічныя вучылішчы ў Лідзе і Валкавыску. Прыём у гэтыя навучальныя ўстановы вызначан усяго ў 2.400 чалавек. Намечана адкрыццё вячэрняга і завочнага педагагічных інстытутаў у Беластоку, завочнага настаўніцкага інстытута і двух завочных педагагічных вучылішч у Пінску.

Цяпер у заходніх абласцях праводзіцца вялікая работа па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы настаўнікаў. У гарадах і паветах разгорнута шырокая сетка курсаў, на якіх навучаецца да 5.000 чалавек. Усе слухачы пасля сканчэння вучобы будуць накіраваны на работу ў школы. Ужо адбыліся выпускі курсаў настаўнікаў у Слоніме, Гродна, Косаве і т. д. У перыяд з 27 снежня да пачатку студзеня Наркамат асветы БССР склікае ў заходніх абласцях БССР павятовыя настаўніцкія нарады з дакладамі прадстаўнікоў Наркамата асветы аб совецкай сістэме народнай асветы і паралку рэарганізаваны школ заходніх абласцей. У першай палавіне студзеня ў заходніх абласцях арганізуюцца настаўніцкія курсы па беларускай мове.

У 1940 годзе ў заходніх абласцях намечана адкрыць 115 дзіцячых дамоў, 10 школ глуханямых, 5 аддараўленчых школ, 2 школы сляпых, 126 вытворчых майстэрняў. Складзены і разасланы на месцы 9 метадычных зборнікаў па пытаннях работы дашкольных устаноў. У бліжэйшы час пачнуць працаваць кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы работнікаў для дзіцячых садоў заходніх абласцей.

НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ У АКАДЭМІЮ НАВУК БССР

Закончылася вылучэнне кандыдатаў у сапраўдныя члены і члены-карэспандэнты Акадэміі навук БССР. На 39 вакантных месц кандыдатамі ў сапраўдныя члены і члены-карэспандэнты вылучана больш 100 чалавек. Зараз прыступілі да работы кваліфікацыйныя камісіі. У пачатку 1940 года адбудуцца выбары.

Сярод кандыдатаў у сапраўдныя члены Акадэміі віднейшыя вучоныя краіны: доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Горацкага сельскагаспадарчага інстытута Ю. А. Вейс, прафесар Маскоўскага зоатэхнічнага інстытута Е. К. Алексееў, доктар біялагічных навук, прафесар Горацкага сельскагаспадарчага інстытута Т. Н. Годнеў, прафесар Беларускага політэхнічнага інстытута Н. А. Прылежаеў, дырэктар інстытута торфу Акадэміі навук БССР, прафесар Г. І. Ануфрыеў, загалчык кафедры гісторыі СССР Саратаўскага універсітэта А. М. Панкратава, доктар эканамічных навук, узнагароджаны ордэнам Леніна, прафесар В. С. Немчынаў, доктар фізічных навук, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Н. С. Акулаў, доктар медыцынскіх навук, заслужаны дзеяч навукі БССР І. Т. Тітоў і інш.

Сярод вылучаных кандыдатаў у члены-карэспандэнты — прафесар Мінскага мединстытута Д. М. Голуб, навуковы работнік балотнага інстытута Б. І. Мешочак, дырэктар інстытута літаратуры і мовы В. В. Барысенка, вучоны сакратар Прэзідыума Акадэміі навук БССР, кандыдат тэхнічных навук К. Е. Зінчэнка, навуковыя работнікі В. І. Шэмпель, А. Е. Сюбараў, галоўны рэдактар атласа БССР прафесар Я. Г. Ракаў, сакратар мінскага абкома КП(б)Б. інжынер-эканаміст А. З. Хаінюмскі і інш.

У выніку выбараў састаў сапраўдных членаў Акадэміі навук БССР павялічыцца да 26 чалавек і членаў-карэспандэнтаў—да 37 чалавек.

Новагоднія падарункі дзецям

ЦК ЛКСМБ атрымаў вялікую колькасць новагодніх падарункаў ад школьнікаў раду гарадоў Совецкага Саюза для вучняў школ заходніх абласцей БССР. Безліч папак, ёлачных упрыгожанняў, гульняў, дзіцячай літаратуры атрымана ад вучняў 11-й школы горада Свердлоўска, ад дзіцячага Дома культуры гор. Куушыно, Калінінскай вобласці, дзіцячага сада «Москвашвей» і інш.

Адкрываюцца школы, амбулаторыі, крамы

ВАЛОЖЫН. (Па тэлефону). Валасны Камітэт Лугамовіцкай воласці пусціў у эксплаатацыю тры малочныя заводы. Адкрыты ветэрынарны пункт і 13 новых крам. У былым маёнтку Вяздуны адкрыта амбулаторыя, заканчваецца абсталяванне раёнальнага дома.

У мястэчку Лугамовічы арганізавана вячэрняя школа для дарослых. Пры кожным сялянскім камітэце ствараюцца хаты-чытальні, дзе працоўныя культурна і весела будуць праводзіць свой вольны ад работы час.

Зімні сезон у Мінску. НА ЗДЫМКУ: на катку. Фото І. Казловіча.

КАНЬКАБЕЖЦЫ ВЫШЛІ НА ЛЁД

У выходны дзень 18 снежня ў Мінску адкрыліся каткі спартыўных таварыстваў «Харчавік» і «Дынамо». Днём і ўвечары на стадыёне «Харчавік» адбылося масавае катанне. На лёд упершыню вышлі хакейныя каманды тэхнікума фізкультуры, завода імені Кірава і таварыства «Харчавік».

Каток «Дынамо» ўжо ў першы дзень адкрыцця быў перапоўнен канькабежцамі. Пачала трэніроўку дзіцячая хакейная каманда «Дынамо». Каток асветлен і ралыёфіцыраван. Працуе раздзявальня і буфет.

24 снежня гарадскі камітэт фізкультуры і спорта на стадыёне «Дынамо» арганізуе бліц-турнір хакейных каманд горада.

ПЯРШЫНСТВА ПА БІЛЬЯРДУ

18 снежня ў Мінску закончыўся рэспубліканскі розыгрыш асабіста-каманднага пяршынства па більярду. Пяршынства аспрэчвалі 36 лепшых більярдыстаў Мінска, Гомеля, Бабруйска і Магілева.

Пяршынства заваявала каманда мінскага спартыўнага таварыства «Буравестнік». У саставе каманды ігракі тт. Янулевіч, Губ і Кульман.

Званне чэмпіёна БССР па більярду заваяваў супрацоўнік магілеўскага Дома Чырвонай Арміі тав. Стасько.

ЛЁДАСТАЎ НА РЭКАХ БССР

Па даных Мінскага ўпраўлення гідраметслужбы, за апошнія дні рэкі БССР паўсямесна пакрыліся ільдом. Некалькі раней звычайнага пакрылася ільдом сёлета Заходняя Дзвіна (ля Суража і Полацка — 25—27 лістапада). Поўнасцю наступіў лёдастаў на Заходняй Дзвіне, Дняпры, Бярэзіне, Сожы і Прыпяці ў перыяд з 13 па 19 снежня. На Сожы ў Прапойску 12 снежня прайшлі апошнія маторная лодка і плыт. 13 снежня з Мазыра адправіўся апошні параход. На Свіслачы ў Мінску лёдастаў наступіў 17—18 снежня. (БЕЛТА).

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ВЯЛІКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

23 снежня Абанемент № 139.
РУСАЛКА
Пачатак у 8 г. веч.
Білеты ў тэатральнай касе Дома саюзаў з 12 да 5 г., у дзень пастаноўкі—у касе тэатра з 6 г. веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

20 снежня Абанемент № 73.
ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ
Пачатак у 7 г. 30 м.
Каса — з 2—8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

20 снежня Абанемент № 43.
МОЙ СЫН
Пачатак у 8 г. вечара.
Каса з 12 да 2 і з 4 да 8 г. вечара.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
«УЧИТЕЛЬ»

Кінотэатр «РОДИНА»
«ВЕЛИКИЙ ГРАЖДАНИН»
(2-я серыя)

Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
«СОРОЧИНСКАЯ ЯРМАРКА»

Кінотэатр «СПАРТАК»
«ЗАКЛЮЧЕННЫЕ»

Дзіцячы кінотэатр
«ВЕЛИКОЕ ЗАРЕВО»

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
Гукавы хранікальны фільм.
«ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ»

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
аб'яўляе ПРЫЁМ слухачоў
НА 7-месячныя ПЕДКУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ГІСТОРЫІ І КАНСТЫТУЦЫІ для 5—7 класаў НСШ і СШ.
На курсы прымаюцца асобы без абмежавання ўзросту, маючыя адукацыю не ніжэй 9 класаў.
Паступаючыя на курсы падвяргаюцца іспытам па рускай і беларускай мовах (пісьмова), па гісторыі СССР у аб'ёме падручніка Шэстакова і палітграмаце.
Курсы пачынаюць працаваць з 1 студзеня 1940 года.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 31 СНЕЖНЯ г. г. Да заявы неабходна прыкласці дакумент аб адукацыі і аўтабіяграфію. Заявы накіроўваць па адрасу: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, біялагічны корпус, дырэкцыі курсаў.
Слухачы курсаў забяспечваюцца стыпендыяй. Іншагароднім студэнтам прадастаўляецца інтэрнат або кватэрныя.

ВІЦЕБСКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ
ВЫКЛІКАЕ НА ЗІМОВУЮ СЕСІЮ
УСІХ СТУДЭНТАЎ, КАМАНДЫРАВАНЫХ НА ПРАЦЯГЛУЮ ПЕДАГАГІЧНУЮ ПРАКТЫКУ.
Пачатак сесіі 1 студзеня 1940 года.
ЗАЎКА АБАВЯЗКОВА. ДЫРЭКЦЫЯ.

УПРАЎЛЕННЮ АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР
патрэбны пакоі
ДЛЯ КУРСАНТАЎ.
З прапановамі звяртацца ў Дом урада, пакой № 60, або па тэлефону № 25-018.

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДА»
патрабуюцца:
ШОФЕР І КАЧАГАРЫ
Звяртацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой № 1.

АРГАНІЗУЙЦЕ РАДАСНУЮ СУСТРЭЧУ НОВАГА ГОДА ШЧАСЛІВЫМ ДЗЕЦЯМ СОВЕЦКАЙ КРАІНЫ!
з 20 снежня па 5 студзеня—
УСЕ НА БАЗАР ЕЛАЧНЫХ УПРЫГОЖАННЯЎ!
Усё для новагодняй ёлкі!
з 20 снежня па 5 студзеня
НА ГАРАДСКІМ СКВЕРЫ
(рог Совецкай і Энгельса)
адкрыт
вялікі ёлачны базар
па продажу ёлачных упрыгожанняў.
У базары ўдзельнічаюць:
МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ
ГУМ
МІНХАРЧГАНДАЛЬ
КОГІЗ
ШКЛОЗБЫТ
і арцель „1 МАЯ"
Школы, клубы, дзіцячыя сады, фабзаўмясцкомы, піонерскія арганізацыі і бацькі!
На ёлачным базары
ВЫ МОЖАЦЕ КУПІЦЬ
у вялікім выбары і асартыменце
новагоднія падарункі дзецям
У ПРОДАЖЫ ЕСЦЬ:
ЦАЦКІ з картона:
РЫБКІ,
ЗАЙЧЫКІ,
ДОМІКІ
і інш.
Розныя шкляныя ўпрыгожанні:
БУСЫ,
ШАРЫ,
ШЫШКІ
і т. д.
Розных размераў дзеды-марозы, мішура, бенгальскія агні.
Спяшайцеся загадзя забяспечыць сябе лепшым наборам ёлачных упрыгожанняў!

У магазін КОГІЗ'а
Совецкая, 71 —
ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
У ВЯЛІКАЙ КОЛЬКАСЦІ
ПЛАКАТЫ і ЛОЗУНГІ,
ПРЫСВЕЧАНЫЯ ВЫБАРАМ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.
БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗа.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
аб'яўляе НАБОР
У ЗАВОЧНУЮ АСПІРАНТУРУ
ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:
фізічная хімія, лесахімія, арганічная хімія, фізіялогія раслін, мікрабіялогія, заалогія, балотазнаўства, хімія торфу, механізацыя сельскай гаспадаркі, фізіялогія сельскагаспадарчых раслін, аграхімія, жывёлагадоўля, эканоміка сельскай гаспадаркі, эканоміка прамысловасці, дыялектычны і гістарычны матэрыялізм, старажытная гісторыя, гісторыя СССР і БССР, новая гісторыя, археалогія, гідрабіялогія, гістарычная геалогія, беларуская мова і беларуская літаратура.
Паступаючыя прадстаўляюць наступныя дакументы: заяву, копію дыплома аб сканчэнні ВНУ (завераную натарыусам), характарыстыку з месца работы, дзве фотакарткі, анкету і аўтабіяграфію.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1940 ГОДА.
Паступаючыя ў аспірантуру падвяргаюцца прыёмным іспытам у аб'ёме ВНУ па наступных прадметах: асновы марксізма-ленінізма, спецыяльная дысцыпліна і замежная мова. Прыёмныя іспыты праводзяцца з 1 па 10 студзеня 1940 года. Пачатак заняткаў з 15 студзеня.
Заявы падаюцца па адрасу: Мінск, Пушкінская, 56, Акадэмія навук БССР, Упраўленне падрыхтоўкі навуковых кадраў.

ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ
МАГІЛЕЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА СТУДЭНТАЎ-ВЫПУСКНІКОЎ, якія знаходзяцца на працяглай педагагічнай практыцы, што яны
АБАВЯЗАНЫ ЗДАЦЬ КУРСАВЫЯ ЗАЛІКІ І ЭКЗАМЕНЫ,
за выключэннем экзамена па школьнай гігіене і прадметах, вынесімых на дзяржэкзамены.
ДЗЯРЖЭКЗАМЕНЫ АДБУДУЦЦА З 1 ПА 15 СТУДЗЕНЯ 1940 г. ПА НАСТУПНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ:
па геафаку — фізічная геаграфія СССР, педагогіка;
па літфаку — педагогіка, беларуская літаратура;
па гістфаку — педагогіка, сярэдняя гісторыя.
ДЫРЭКЦЫЯ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказнага рэдактара — 21-352; Адказнага сакратара—25-188; Літаратурнага сакратарыята — 22-412; Сакратарыята — 21-846; АДДЗЕЛАЎ: Партыйнага — 21-353; Совецкага будаўніцтва, гандлю і прамысловага — 21-356; Сельскагаспадарчага — 20-830; Літаратуры і мастацтва — 23-955; Прапаганды і мясцовай інфармацыі — 25-189; Школ, навукі і ваеннага — 21-556; Пісем — 20-844, 21-390, 21-885; Загадчык выдавецтва—21-358; Аб'яў—21-845; выпускаючага—24-768.

Уп. Галоўлітбела № Б—1843. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.